ПРАЛЕТАРЫ ВСЕГА СВЕТА, СОЕДИНЯЙТЕСЬ!

ЗЬВЯЗДА

№ 169 (3277) Субота, 27-га ліпеня 1929 г.

Орган Цэнтральнага і Менскага Камітэтаў Камуністычнай Партыі (б) Беларусі.

Адрас рэд. і канторы: Менск, Савецкая, 63
ШТОДЗЕННАЯ ГАЗЭТА, ГОД ВЫДАНЬНЯ XIII
Тэлефоны: рэдактар—1074, сакратар—619, кантора—781

ГАДЫЦЬ У ГАДЗ. НОЧЫ:

ВАРШАВА, 25. Беларуская газэта «Сьвет» паведамляе аб правале зьезду т-ва беларускай школы, скліканага 9 ліпеня ў Вільні беларускімі згодніками, вядомымі пад назваю «беларускай санацыі». На зьезд прыбылі ўсяго 23 дэлегаты, у тым ліку 11 інтэлігентаў, блізкіх к пілсудчыкам. Гэты відавочны правал беларускіх згоднікаў прымусіў іх капітулываць і прызнаць праўленьне, абранае раней на зьезьдзе беларускага т-ва «Школа».

АПОШНІЯ НАВІНЫ Б. С. С. Р.

ГОМЕЛЬ (наш кар.). ГЭТЫМІ ДНЯМІ АРГАНІЗАВАНЫ ВЯЛІКІ КАЛГАС У АРЭВІЧАХ, ХОЙНІЦКАГА РАЁНУ. КАЛГАС МАЕ ПЛОШЧУ Ў 2500 ГЭКТАРАЎ І Ў БЯГУЧЫМ ГОДЗЕ ДАСЬЦЬ ДА 60 ТЫСЯЧ ПУДОЎ СЕНА. У КАЛГАСЕ БУДЗЕ ПАБУДАВАНЫ ЧАРАПІЧНА-ЦЯГЕЛЬНЫ ЗАВОД. НАБЫВАЕЦЦА ЖЫВЁЛА, ТРАКТАР І ІНШЫЯ СЕЛЬ.-ГАС. МАШЫНЫ.

АБ ПРАВЫМ УХІЛЕ У КП(б)Б ПА НАЦЫЯНАЛЬНЫМ ПЫТАНЬНІ

Абвешчанае 15-м зьездам УсеКП(б) узмацненьне сацыялістычнага наступленьня не абходзіцца, ды і ня можа абыйсьціся (наперакор усякім правым «тэорыям») без супраціўленьня, часамі вельмі вострага, капіталістычных кляс, якія асуджаны на выміраньне.

Кулак і нэпман, што выцясьняюцца ўсё больш і больш з сваіх пазыцый, вядуць барацьбу з намі, як непасрэдна (тэор, антысавецкая агітацыя, арганізацыя контр-рэвалюцыйных кулацкіх груп для зрыву мерапрыемстваў савецкай улады, шпіянаж на карысьць замежных контр-разьведак і інш.), так і праз сваіх дапаможнікаў у нашых апаратах (галоўным чынам—з рознага роду «былых» чыноўнікаў, а таксама спэцаў, паўінтэлігентаў, інтэлігентаў, тылу шахцінскіх шкоднікаў і г. д.). Гэтыя агенты кулака і нэпмана спрабуюць, часамі не бяз посьпеху, скажаць лінію ў рабоце нашых устаноў у інтарэсах капіталістычных элемэнтаў. Апошнія знаходзяць сабе шырокае падтрыманьне таксама сярод рэлігійнікаў усіх колераў і антысэмітаў. Працэсы розных контр-рэвалюцыйных арганізацый, што праводзілі сваю работу пад флагам рэлігійных таварыстваў, і антысэміцкія выступленьні перакананаўча паказваюць на змычку гэтых элемэнтаў з кулаком і нэпманам, на агульнасьць іх мэтаімкненьняў.

Але ня толькі яны дапамагаюць кулаку і нэпману. Бывае і так, што нацыску варожых сацыялізму кляс паддаюцца таксама паасобныя, няўстойлівыя элемэнты ўнутры самой нашай партыі.

У выніку за мінулы пэрыяд, мы мелі ў БССР прарывы на некаторых вучастках нашай работы (правыя скажэньні ў рабоце НКЗ, НКФ, крэдытных органаў, Дзяржстраху, у будаўніцтве сампрамкаапэрацый і інш.), супроць якіх ЦК КП(б)Б вёў рашучую барацьбу.

Паралельна і адначасова з гэтым абвастрэньнем барацьбы капіталістычных элемэнтаў беларускага гораду і вёскі супроць нашых сацыялістычных мерапрыемстваў ідзе і абвастрэньне барацьбы супроць нацыянальнай палітыкі КП(б)Б. Гэта супадзеньне зусім не выпадковае. Нацыянальная палітыка нашае партыі ёсьць перш за ўсё клясавая палітыка. Мы ня мысьлім сабе вырашэньня нацыянальнага пытаньня ў БССР без адначасовага зьнішчэньня эксплёататарскіх кляс усіх нацыянальнасьцяй. Натуральна, што кулаку і нэпману не спадабаецца такая наша нацыянальная палітыка. Яны дабіваюцца другой нацпалітыкі, пры якой маемасныя іх інтарэсы ня былі-б закрануты. Беларускі кулак, напрыклад, зусім задаволіўся-б такой нацыянальнай палітыкай, якую ў Заходняй Беларусі праводзіць польскі фашызм. Заходня-беларускія нацыянал-дэмакраты Луцкевіч, Астроўскі і інш. аказваюць такой нацпалітыцы поўнае сваё падтрыманьне, «верай і праўдай» служаць польскаму фашызму.

У сілу гэтых прычын, выступленьні супроць нацыянальнай палітыкі КП(б)Б, якія мелі месца за гэты пэрыяд у БССР, маюць значэньне правай спробы абараніць капіталістычныя элемэнты беларускага гораду і вёскі, якія руйнуюцца нашым сацыялістычным наступленьнем.

У гэтым нас пераконвае і самая сутнасьць выступленьняў супроць нацыянальнай палітыкі КП(б)Б, якія ідуць за апошні пэрыяд, галоўным чынам, з боку беларускіх нацыяналістых. Гэтых выступленьняў было шмат у органах пэрыядычнага друку (пераважна ў «Савецкай Беларусі» і «Полымі»), у розных непэрыядычных зборніках і г. д. Аўтарамі падобнага роду публічных выступленьняў былі і некаторыя члены КП(б)Б. Самі выступленьні старанна маскаваліся: штодзённыя патрэбы дня трактаваліся пад псэўдонімамі, здавалася-б далёкіх ад сучаснасьці, пытаньняў гісторыі, літаратуры, мастацтва і г. д.

Гэтыя дзьве апошнія акалічнасьці тлумачацца манапольным становішчам камуністычнай партыі ў палітычным жыцьці нашай краіны і поўнай дыскрэдытацыяй у сьвядомасьці шырокіх працоўных мас Беларусі буржуазных і дробнабуржуазных партый. У сілу гэтай падвойнай прычыны, розныя дробнабуржуазныя ідэалёгіі, актывізуючыся ў зьвязку з абвастрэньнем клясавай барацьбы, па неабходнасьці спрабуюць, папершае, прабівацца наверх праз голавы паасобныя, пераважна і ў мінулым, і ў сучасным цесна зьвязаных з нацыяналістычнай верхавінай беларускай інтэлігенцыі, членаў кіруючай камуністычнай партыі, якая карыстаецца бязьмежным давер'ем у шырокіх масах і, падругое—гэтыя свае напады на партыйную лінію часта праводзяць ва ўсяляк замаскаванай форме.

Тым, ня менш, і пад гэтай падвойнай маскай, пры ўважлівым разглядзе няцяжка ўбачыць усё той-жа знаёмы твар клясавага ворага—кулака і нэпмана, якія імкнуцца захаваць сваё існаваньне ва ўмовах наступаючага сацыялізму.

І сапраўды, навошта было патрэбна т. З. Жылуновічу («Полымя» № 10 за 1928 г., № 4 за 1929 г.) і яго аднадумцам, праз дваццаць год, у 1929 г., ідэалізаваць і ўвяскрашаць «залаты век» «Нашай Нівы» з яе кулацка-буржуазнай праграмай падтрыманьня стальпінскіх хутароў, з яе пропаведзьдзю нацыянальна-буржуазнага адзінства? *) Дзеля чаго і для каго гэта патрэбна ў наш час?

Дзеля чаго патрабуецца зараз заднім числом перайменаваць БСГ (Беларуская Сацыялістычная Грамада) у БС-ДРП, у сэкцыі РКП, фальсіфікуючы гісторыю КП(б)Б, «даводзячы», што быццам бы БСГ была творцаю Кастрычніка ў Беларусі?

На чыю руку, да чыёй выгады, для каго патрэбна сёньня шкадаваць аб разгоне бальшавікамі кулацкага беларускага ўстаноўчага сходу («кангрэс» 18 г.), аб яго «недагаласаваных» рэзалюцыях?

Што азначае зараз зноў выцягнуць на сьвет (артыкулы Т. Глыбоцкага, З. Жылуновіча, М. Зарэцкага ў «Савецкай Беларусі» за 1928 г.), зашарпаную, даўно выкрытую марксызмам і ленінізмам тэорыю аб «самабытнасьці», згодна якой наша сучасная сацыялістычная беларуская культура, літаратура і мастацтва павінны карыстацца буржуазнай і нават фэадальнай старажытнасьцю, разьвівацца на кулацкіх «Апраметных», на лягендах і казках часоў Афросіній Полацкіх і Клімэнтаў Смаляцічаў? Якой клясе патрэбен такі зьмест лёзунгу аб самабытнасьці?

Для каго, у чыіх інтарэсах сёньня зноў узьнімаць пытаньне аб «арыентацыі», аб «Усходзе» і «Захадзе»? Адкуль дзьме вецер нездавальненьня ўсім «маскоўскім», «агульнасаюзным» (Т. Глыбоцкі, М. Зарэцкі—тыя-ж артыкулы)? і г. д., і г. д.

На ўсе гэтыя пытаньні нельга даць другога адказу, акрамя таго, што: 1. Гэта патрэбна варожым сацыялізму клясам унутры нашай краіны для чарговай спробы скрывіць лінію КП(б)Б у нацыянальным пытаньні ў бок буржуазнай ідэалёгіі «адзінага нацыянальнага фронту», у бок зьмякчэньня нашай клясавай устаноўкі ў нацыянальнай палітыцы, у канчатковым выніку—у бок зьмякчэньня нашага наступленьня на кулака і нэпмана ў БССР;

2. Гэта патрэбна таксама польскаму фашызму і яго прыслужнікам беларускім нацыянал-фашыстым з Заходняй Беларусі (Луцкевіч, Астроўскі і інш.), якія ўсімі мерамі імкнуцца паслабіць сувязь, што злучае нацыянальныя савецкія рэспублікі ў адзіны Саюз, і якія ліхаманкава рыхтуюць пляцдарм для нападу на СССР.

Па ўсіх гэтых пытаньнях, як і па радзе іншых аналёгічных, ёсьць вычарпальныя пастановы і ўстаноўкі зьездаў і інш. кіруючых парторганаў КП(б)Б, здавалася-б абавязковыя для ўсіх членаў КП(б)Б. І тым ня менш, паасобныя члены нашай партыі лічаць для сябе магчымым зноў і зноў узьнімаць і востра ставіць гэтыя пытаньні. Далёкі-ж адыход такіх членаў ад партыі!

Гэты рост беларускага нацыяналізму адбываецца адначасова з ростам іншых шавінізмаў у нашай рэспубліцы: расійскага, яўрэйскага, польскага. Узмоцнена наступаючы на капіталістычныя элемэнты гораду і вёскі, мы ня робім розьніцы паміж імі па нацыянальнай адзнацы. Гэты наш націск на капіталістычныя элемэнты ўсіх нацыянальнасьцяў кулакі, нэпманы і іх ідэолёгі заўсёды гатовы прадставіць і раздуць, як націск на ЎСЮ тую нацыю, да якой яны належаць. Адсюль, іменна, і вырастае ў нашых умовах ідэалёгія «адзінага нацыянальнага фронту»—шавінізм. Іменна пад націкам гэтай, варожай нам ідэалёгіі ў паасобных членаў нашай партыі і атрымаліся ПРАВЫЯ скажэньні ў практыцы правядзеньня нацработы (памылкі паасобных яўрэйскіх работнікаў у пытаньнях упарадкаваньня мястэчак, камплектаваньня яўрэйскіх калгасаў, у сампрамкаапэрацыі, «фрагмэнты» расійскіх шавіністых, зьявішчы высокамерных адносін паасобных польскіх таварышоў да культур іншых нацыянальнасьцяў і г. д.).

Барацьба з усякага роду шавінізмам і нацыяналізмам ніколі ня спынялася нашай партыяй. Уся, параўнальна кароткая, гісторыя КП(б)Б, літаральна, напоўнена гэтай барацьбой. Аднак, у кожны даны адрэзак часу, асноўны агонь гэтай барацьбы сканцэнтроўваўся на якім-небудзь, найбольш небясьпечным у тым пэрыядзе, нацыяналізьме. Пры гэтым заўсёды ўдубальт падкрэсьлівалася няўжытнасьць для партыі хаця-б малейшага паслабленьня барацьбы з іншымі нацыяналізмамі. Тактыка гэта была правільнай і зусім апраўдала сябе. Аб гэтым сьведчаць вялікія дасягненьні, якія мы маем у практыцы вырашэньня нацыянальнага пытаньня ў Беларусі, і тая кансалідацыя вакол нашай партыі і савецкай улады працоўных мас усіх нацыянальнасьцяў БССР, якую мы наглядаем.

Абвастрэньне клясавай барацьбы ўнутры краіны і ліхаманкавая работа міжнароднага, у першую чаргу польскага імпэрыялізму, па падрыхтоўцы ваеннага нападу на Савецкі Саюз, прымушаюць нас, на даным гістарычным этапе ўсямерна ўзмацніць барацьбу з усімі шавінізмамі, як зброяй контр-наступленьня на нас клясавага ворага і сканцэнтраваць галоўны агонь на найбольш актыўным, найбольш небясьпечным у даны момант нацыяналізьме.

Вялікадзяржаўны расійскі шавінізм у БССР, які доўгі час панаваў, адкрыта і актыўна выступаў супроць нацыянальнай палітыкі КП(б)Б, дзякуючы энэргічным нашым мерапрыемствам зараз прытаіўся, рэдка выступае адкрыта, дзейнічае цішком. Удары расійскім нацыянал-дэмакратам і зьменавехаўцам, што наносяцца ў РСФСР, адчувальны і для расійскіх шавіністых на тэрыторыі БССР. Але, паколькі асноўная база для разьвіцьця вялікадзяржаўнага расійскага нацыяналізму ва ўмовах РСФСР застаецца ўсё яшчэ вялікай, паколькі з абвастрэньнем клясавай барацьбы вялікадзяржаўны расійскі нацыяналізм актывізуецца і, у сваю чаргу ўзмоцнена харчуе вялікадзяржаўныя імкненьні расійскіх шавінізмаў у нацыянальных рэспубліках, пастолькі нам, у БССР, ня толькі ня прыходзіцца ў якой-небудзь ступені паслабляць нашу ўвагу да барацьбы з гэтым шавінізмам, але трэба гэтую барацьбу ўсяк узмацняць, выцягваць гэты нацыяналізм з усіх прытульных куткоў, дзе ён зараз прытаіўся, выкрываць яго праяўленьні, як бы яны старанна ня былі замаскаваны.

Яўрэйскі нацыяналізм, зьяўляючыся ідэалёгіяй гарадзкіх і местачковых нэпманаў, а таксама нацыяналістычнай часткі яўрэйскай інтэлігенцыі, сплятаючыся з ваяўнічым клерыкалізмам, прадстаўляе ў даны момант ва ўмовах БССР, у зьвязку з узмацненьнем сацыялістычнага наступленьня, больш актуальную небясьпеку, чым раней. Абвастрэньне клясавай барацьбы адбілася на актывізацыі яўрэйскага нацыяналізму. Ідэалёгія яўрэйскага «адзінства нацыянальнага фронту» прывяла ўжо, як мы бачылі, да прарываў на паасобных вучастках нашай работы.

Польскі шавінізм у сучасных ўмовах таксама актывізуецца. Вельмі часта гэтая яго актывізацыя зьяўляецца выніткам ня толькі агульных сацыяльных прычын, але і падмацоўваецца непасрэдная работай агентуры польскай дэфэнзывы.

Невыстарчальная клясавая дыфэрэнцыяцыя і некаторая нацыянальная замкнутасьць і абасобленасьць польскага насельніцтва ў БССР паказвае, што націск ідэалёгіі польскага «адзінага нацыянальнага фронту» досыць моцны. Гэтаму націску могуць паддавацца (і паддаюцца ў паасобных выпадках) таксама і некаторыя камуністыя-палякі.

Няма патрэбы даводзіць усю небясьпеку польскага нацыяналізму ў БССР у зьвязку з ваеннымі плянамі пілсудчыны.

Небясьпека беларускага нацыяналізму заключаецца перш за ўсё ў тым, што ўнутры краіны ён мае значную базу на вёсцы ў асобе ўзмацнеўшага за годы НЭП'у беларускага кулака, а ў горадзе—шавіністычную верхавіну, галоўным чынам, старой беларускай інтэлігенцыі, частку былых чыноўнікаў, былых і цяперашніх гандляроў і дамаўласьнікаў—беларусаў. Небясьпека беларускага нацыяналізму ў шмат раз узрастае і ў зьвязку з тым, што яго пляны і дзейнасьць поўнасьцю ўвязваюцца з плянамі і дзейнасьцю беларускага нацыянал-фашызму ў Заходняй Беларусі, які зьяўляецца простым дапаможнікам пілсудчыны ў яе ваенных плянах супроць СССР. Небясьпека беларускага шавінізму і нацыянал-дэмакратызму заключаецца таксама і ў тым, што, у зьвязку з абвастрэньнем клясавай барацьбы ў нашай рэспубліцы, ён ня толькі абараняецца супроць сацыялістычнага наступленьня, але, як мы бачылі, рашуча наступае.

Вось чаму, зусім не паслабляючы, а ўзмацняючы, сучасны больш барацьбу з усімі нацыяналізмамі, якія прадстаўляюць на даным этапе небясьпеку, што ня гасьне, а ўзрастае, мы павінны асноўны агонь накіраваць на беларускі наступальны шавінізм і нацыянал-дэмакратызм.

Мы павінны мабілізаваць вакол пытаньняў узрастаючай небясьпекі ўсіх відаў нацыяналізму і шавінізму, асабліва на даным этапе—беларускага, як самага небясьпечнага, грамадзкую ўвагу шырокіх партыйных і рабочых мас. Разам з тым трэба своячасова і дакладна выкрываць усе праяўленьні ўсіх нацыяналізмаў, папярэджваючы гэтым паўтарэньне наскокаў на лінію партыі ў нацпытаньні.

Мы павінны больш рашуча праводзіць у жыцьцё пастанову XII зьезду КП(б)Б аб вылучэньні новых пралетарскіх і паўпралетарскіх кадраў, у першую чаргу, з работнікаў-беларусоў, на ўсе вучасткі нашай работы, асабліва для культурнага фронту, як вучастку ў цяперашні час менш другіх забясьпечанага сіламі. Побач з гэтым вылучэньнем павінна быць забясьпечана таксама спэцыяльная падрыхтоўка і перападрыхтоўка работнікаў.

У той-жа час мы павінны весьці бязьлітасную барацьбу і ня спыняцца перад ізаляцыяй тых элемэнтаў сярод нашых кадраў, якія генэральную лінію нашай партыі скажаюць у інтарэсах варожых нам кляс.

Асноўная маса інтэлігенцыі БССР, за годы савецкай улады, арганічна зраслася з справай пралетарыяту і сумленна працуе зараз пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі над ажыцьцяўленьнем ўзмоцненага сацыялістычнага наступленьня на элемэнты капіталізму ў нашай краіне.

Але ёсьць і другая, колькасна невялікая, частка былых папутчыкаў з верхавіннага пласту старой інтэлігенцыі, якая, як мы бачылі, іменна ў зьвязку з узмацненьнем сацыялістычнага наступленьня і ўскладненьнем міжнароднага становішча СССР, адыйшла ад нас, перакінулася ў лягер ворагаў і вядзе цяпер з намі барацьбу.

З гэтай часткай інтэлігенцыі нам ня толькі не па дарозе, але мы яе інакш, як агентуру клясавага ворага, разглядаць і ацэньваць ня можам. На яе ня могуць і не павінны пашырацца пастановы нашай партыі, якія адносяцца да пэрыяду пачатку сацыялістычнага і культурнага будаўніцтва ў нацыянальных рэспубліках. Усякі, хто гэтага не разумее, хто лічыць магчымым, па меркаваньнях вузкага дзяляцтва, захаваць і далей ранейшыя адносіны з гэтай часткай інтэлігенцыі, той нічога не разумее ў разгорнутай клясавай барацьбе. З гэтай часткаю інтэлігенцыі, на даным этапе, магчымы толькі адны адносіны—адносіны барацьбы.

Пытаньні беларусізацыі набываюць цяпер зусім выключнае значэньне. Іменна ў зьвязку з абвастрэньнем клясавай барацьбы, у зьвязку з наскокамі кулака, нэпмана і яго вольных і нявольных агентаў—ідэолёгаў на лінію партыі ў нацыянальным пытаньні, трэба завастрыць нашу ўвагу на ўзмацненьні тэмпу беларусізацыі. Не таму, што ў нас да гэтага часу ў гэтых адносінах «нічога не рабілася», як хочуць прадставіць шавіністыя (ліст трох беларускіх пісьменьнікаў у газэту «Савецкая Беларусь»), беларусізацыя за апошні пэрыяд зрабіла вялікі крок наперад. Але гэтага МАЛА ЦЯПЕР, калі паміж пралетарыятам і вясковым кулаком так абвастрэцца барацьба за сярэдняе сялянства, калі кадры пралетарыяту ў Беларусі, якія колькасна павялічваюцца і палітычна і культурна растуць, шчыльна набліжаюцца да «аўладаньня культурнымі каштоўнасьцямі», да яшчэ большага ўзмацненьня тэмпаў будаўніцтва беларускай культуры «нацыянальнай па форме і пралетарскай па зьместу». У гэтых умовах існуючы тэмп працэсу беларусізацыі ўжо невыстарчальны і павінен быць узмоцнены.

Перад Міжнародным Чырвоным Днём

Узмацненьне буржуазнага тэрору

ПОЛЬШЧА ПЕРАД 1 ЖНІЎНЯ

ВАРШАВА, 24. У зьвязку з надыходзячым днём 1-га жніўня дэпутатамі камфракцыі Росякам і Керузальскім былі арганізаваны ў Лодзі вялікія мітынгі, на якіх дэпутаты выступалі з прамовамі, прысьвечанымі падрыхтоўцы імпэрыялістымі нападу на СССР, у прыватнасьці падзеям у Манчжурыі. Пасьля мітынгу адбылася вялікая дэманстрацыя рабочых, у якой удзельнічала некалькі тысяч чалавек. Вялікія атрады паліцыі разагналі дэманстрантаў.

Вялікія дэманстрацыі адбыліся таксама і ў Вільні. На вялікім мітынгу на рынку з вялікай прамовай выступіў дэпутат ад беларускай рабоча-сялянскай фракцыі Дварчанін, які заклікаў масы абараняць СССР ад замахаў міжнародных імпэрыялістых і да салідарнасьці з савецкім урадам у яго выступленьні супроць захвату К.—Усх. чыг. У часе прамовы Дварчаніна ў натоўпу былі разгорнуты сьцягі з рэвалюцыйнымі лёзунгамі і раскіданы адозвы, прысьвечаныя дню 1-га жніўня. Конная і пешая паліцыя разагнала мітынг і зрабіла арышты.

З цэлага раду гарадоў паведамляюць, што паліцыя ў зьвязку з 1-га жніўня ўжо распачала масавыя арышты. У прыватнасьці вялікія арышты зроблены на Заходняй Украіне. Польская прэса заклікае ўладу да ўжыцьця папярэджваючых мер, каб недапусьціць камуністычных выступленьняў 1-га жніўня. «Газэта Варшаўска» прызнае, што часы, калі можна было сьпявацьаб «спакойнай і вясёлай вёсцы» мінулі без звароту. Рэвалюцыйная прапаганда зрабіла посьпехі і прасякнула ў глыбокія пласты. 1 жніўня дзейнасьць камуністых узмоцніцца. Зразумела, непасрэднае небясьпекі камуністычнага перавароту ў Польшчы ня існуе, але трэба было-б не драмаць перад жнівеньскім парадам камуністычнай партыі.

Адозва выканкому ўнітарнай канфэдэрацыі працы

ПАРЫЖ, 22. Выканком унітарнай канфэдэрацыі працы зьвярнуўся з адозвай да рабочых, у якой заклікае іх стварыць у адказ на фашысцкі тэрор ураду і праз галавы рэфармісцкіх правадыроў адзіны фронт пралетарскай абароны супроць фашысцкага тэрору, супроць здрадніцтва рэфармістых і за абарону патрабаваньняў рабочых, за абарону СССР і за падрыхтоўку забастовак і дэманстрацый 1-га жніўня. (ТАСС).

КАНФЭРЭНЦЫЯ РАБОЧЫХ І СЛУЖАЧЫХ ПАРЫЖУ—ЗА ПРАВЯДЗЕНЬНЕ 1-га ЖНІЎНЯ

ПАРЫЖ, 22. Адбылася канфэрэнцыя рабочых і служачых дзяржаўных устаноў, пошт і тэлеграфаў, чыгуначных кампаній, муніцыпальных прадпрыемстваў, вадаправода, газавых заводаў, электрычных станцый, больніц і г. д. Прысутнічала 250 дэлегатаў. Канфэрэнцыя аднагалосна прыняла рэзалюцыю, у якой заклікае ўсіх рабочых і служачых прыняць чынны ўдзел у падрыхтоўцы і правядзеньні дня 1-га жніўня, а таксама працятвяць рашучую барацьбу за свае эканамічныя патрабаваньні.

Рабоча-сялянскія зьезды ў Францыі

ПАРЫЖ, 25. Ня гледзячы на рэпрэсіі рабочыя арганізацыі працягваюць падрыхтоўку да 1-га жніўня. 21-га ліпеня ў радзе правінцыяльных гарадоў адбыліся рабоча-сялянскія зьезды.

Заклік да дэманстрацый 1-га жніўня

ПАРЫЖ, 25. Бэльгійская кампартыя апублікавала новыя адозвы да працоўных і салдат з заклікам выйсьці на вуліцу 1-га жніўня, выступіць на абарону СССР супроць імпэрыялістычнай вайны, за паляпшэньне ўмоў жыцьця рабочае клясы. Кампартыя заклікае таксама да ўдзелу ў міжнародным анты-ваеннай дэманстрацыі, якая адбудзецца 28-га ліпеня ў Аахэне.

Арышты камсамольцаў у Баўгарыі

ВЕНА, 18. Сафійскія газэты паведамляюць падрабязнасьці аб арышце ў палове ліпеня рабочага сходу каля сяла Горна, у ваколіцах Софіі. У сходзе ўдзельнічала каля 150 чалавек. Паліцыя сьцьвярджае, што за апошні час у ваколіцах Софіі адбыўся рад сходаў, наладжаных баўгарскім камсамолам для абгаварэньня пытаньня аб падрыхтоўцы да 1-га жніўня. Большасьць арыштаваных—гэта маладыя рабочыя і вучнёўская моладзь. (ТАСС).

ПРАЦЭС 52 У СОФІІ

ВЕНА, 24. У Софіі ў бліжэйшы час пачнецца працэс 52-х на чале з былым сакратаром баўгарскай камуністычнай партыі Младэнам Сталянавым, арыштаваных у сакавіку месяцы па абвінавачаньні ў арганізацыі нелегальнай камуністычнай партыі. (ТАСС).

ЭНЭРГІЧНАЯ ПАДРЫХТОЎКА БЭЛЬГІЙСКАГА ПРАЛЕТАРЫЯТУ

ПАРЫЖ, 21. У Брусэлі падрыхтоўка да 1-га жніўня праводзіцца вельмі энэргічна. Праводзіцца рад мітынгаў. У сваю чаргу ўлады робяць усё, каб сарваць кампанію па правядзеньні чырвонага дня, у прыватнасьці робяць націск на друкарні. Орган партыі «Драпэ Руж» заяўляе, што рэвалюцыйныя рабочыя Бэльгіі самым рашучым чынам абураюцца тым агідным мэтадам, які ўжывае бэльгійская буржуазія і паліцыя ў іх барацьбе супроць міжнароднага чырвонага дня.

АРЫШТ БЫЛОГА РЭДАКТАРА «ЮМАНІТЭ»

ПАРЫЖ, 26. Арыштаваны былы адказны рэдактар «Юманітэ» Пэнет Прэст па абвінавачаньні ў закліку вайскоўслужачых да непаслушэньства.

АРЫШТЫ Ў ГРЭЦЫІ

АТЭНЫ, 25. У зьвязку з падрыхтоўкай да міжнароднага чырвонага дня ў Атэнах праведзены шматлікія арышты рабочых.

Працяг гл. на 2-й стар.

Нямецкія госьці ў СССР

Прыезд нямецкіх рабочых

НЕГАРЭЛАЕ, 26. (Па тэлефону ад наш. спэц. кар-та. Сёньня, а 8-ай гадзіне ўвечары ў СССР прыехалі 6 нямецкіх рабочых, якія зьявіліся ахвярамі цэргібэлеўскай бойні, арганізаванай 1 мая ў Бэрліне.

Усе яны нядаўна выпісаліся з больніц, дзе ляжылі ад атрыманых агнястрэльных ран, пераважна ў сьпіну. Прыехаўшыя таварышы яшчэ ня зусім здаровыя. Адзін з іх моцна кульгае.

Гэтыя нямецкія рабочыя едуць прымаць удзел у сьвяткаваньні Чырвонага Міжнароднага Дню, ў Маскве. Пасьля яны накіруюцца для папраўкі здароўя на адзін з нашых паўднёвых курортаў.

У гутарцы з нашым спэцкорам прыехаўшыя рабочыя паведамілі:

— Ня гледзячы на тое, што мы зьявіліся нявінныімі ахвярамі першамайскай бойні, бо былі збіты і паранены стрэламі, выпадкова знаходзячыся на вуліцы, паліцыя працягвае нас прасьледаваць. За намі сочаць, нас часта дапытваюць з мэтай абавязкова дабіцца «прызнаньня» і нейкіх «доказаў» нашай «антыдзяржаўнай дзейнасьці». Гэта робіцца з аднаго боку для таго, каб пасадзіць нас у турму, а з другога боку—каб пазбавіць нас магчымасьці атрымаць ад дзяржавы кампэнсацыю за тое, што паліцыя зрабіла нас на ўсё жыцьцё інвалідамі.

А 9-й гадзіне нямецкія рабочыя паехалі ў Маскву.

Нямецкія піянэры ў БССР

НЕГАРЭЛАЕ, 26. (Па тэл. ад нашага спэц. кар-та). З бэрлінскім экспрэсам прыехала дэлегацыя нямецкіх піянэраў у складзе 15 чалавек. Дэлегацыю спаткалі прадстаўнікі ЦК ЛКСМБ, менскіх піянэраў і негарэльскія піянэры і акцябраты. Дэлегацыя едзе прыняць удзел ва Ўсесаюзным зьлёце піянэраў. Сродкі для пасылкі дэлегацыі былі сабраны нямецкімі рабочымі і камуністымі.

Гарачае спатканьне ў Менску

Да часу прыходу кур'ерскага цягніка з Негарэлага з нямецкімі рабочымі і дэлегацыямі нямецкіх піянэраў менскі вакзал быў запружаны шматлікімі дэлегацыямі камсамолу, піянэрыі, прафсаюзаў і МОПР'у. Нямецкім госьцям было арганізавана гарачае спатканьне. Нямецкім рабочым былі прыпаднесены шматлікія падарункі.

В.

Прамысловы крызіс у Румыніі

ВЕНА, 24. Прамысловы крызіс у Румыніі асабліва цяжка адбіўся на фабрыках абутку. З-за адсутнасьці збыту, спыніла работу на 6 тыдняў абуткова фабрыка ў Тэмэшвары (буйнейшае прадпрыемства гэтай галіны ў Румыніі). Закрыта таксама абуткова фабрыка ў Гросвардэйне. Фабрыка «Прымус» скарацiла лік рабочых з 300 да 180, абуткова фабрыка «Кармэн»—з 300 да 200 чалавек. Абуткова фабрыка Рэнэра ў Клаўзэнбургу выпускае штодзенна замест 1.000 толькі 250 пар абутку. Фабрыка Сэнтыс ў Бухарэсьце загружана толькі напалову. З прычыны скарачэньня вытворчасьці ў абуткова прамысловасьці, пазбавілася работы 5.000 рабочых. (ТАСС).

АГУЛЬНА-НЯМЕЦКІ КАНГРЭС ЖАНЧЫН-РАБОТНІЦ

БЭРЛІН, 24. Агульна-нямецкі кангрэс жанчын-работніц адбудзецца 6-га кастрычніка. Апублікавана адозва, якая заклікае жанчын-работніц абраць дэлегатак на кангрэс. (ТАСС).

У ФАШЫСЦКАЙ ПОЛЬШЧЫ

РАБОЧЫ РУХ

Гаспадарчы крызіс у Польшчы што раз, то ўсё больш паглыбляецца. Кожны дзень зачыняюцца ўсё новыя фабрыкі і заводы, тысячы рабочых выкідваюцца на вуліцу. На тых жа фабрыках і заводах, якія яшчэ працуюць, прадпрыемцы стараюцца выціснуць з рабочых апошнія сокі. На такую страшэнную—проста дзікую эксплёатацыю рабочыя адказваюць забастоўкамі з патрабаваньнем паляпшэньня як свайго эканамічнага становішча, так і ўмоў працы. «Дзеньнік Віленскі» у адным з сваіх нумароў падае, што ў Вільні з 25-га мая і да гэтага часу цягнецца яшчэ забастоўка рукавічнікаў. Бастуючыя ў ліку 200 чалавек патрабуюць ад фабрыкантаў работы для ўсіх беспрацоўных рукавічнікаў, а таксама заключэньня калектыўнае ўмовы.

У Вільні-жа на Кальварыйскай гуце, дзе працуе 150 рабочых, выбухнула забастоўка.

Забастоўшчыкі прад'явілі патрабаваньне павялічэньня заработнае платы, а таксама і ўмоў працы. Дзякуючы стойкасьці бастуючых, прадпрыемцы пайшлі на ўступкі і павялічылі заработную плату на 20 проц., а таксама падпісалі з рабочымі новы калектыўны дагавор.

У палове ліпеня выбухнула забастоўка на лесапільным заводзе ў Стаўпецкім павеце. Прычынай забастоўкі было звальненьне рабочага бяз згоды прафсаюзу. Для ліквідацыі забастоўкі з Вільні выехаў акруговы інспэктар працы.

У мінулым тыдні на лесапільным заводзе «Гарадок» у Белавежы з прычыны нявыплаты заработнае платы каля 200 рабочых сабралася перад канцылярыяй заводу і пачалі рашуча і востра дабівацца ад кіраўніка заводу выплаты належнае ім заработнае платы.

З прычыны таго, што перагаворы паміж рабочымі і кіраўніком закончыліся бязвынікова і яшчэ больш завастрылі сытуацыю, пры чым магло дайсьці да разрухаў, у Белавеж тэрмінова прыехаў староста, якому пасьля доўгіх перагавораў з рабочымі і ўдалося ліквідаваць канфлікт.

„Небясьпека анархіі і грамадзянскай вайны" ў Польшчы

ВАРШАВА, 26. Друк ўдзяляе шмат увагі лісту варшаўскага карэспандэнта цэнтральнага органу нямецкай сацыял-дэмакратыі «Форвэртса». Карэспандэнт падкрэсьлівае, што калі сойм да гэтага часу не разагнаны, дык толькі таму, што амэрыканскі дарадца ў Польшчы Дзэві патрабуе, каб адказнасьць за амэрыканскія пазыкі Польшчы ляжала на ўсёй краіне, а не на асобнай пэрсоне. Па думцы карэспандэнта, напружаныя адносіны паміж фактычнай дыктатурай і мнімым парлямэнтарызмам ня могуць доўга працягвацца.

У заключэньне карэспандэнт заяўляе, што Польшча стаіць перад «небясьпекай анархіі і грамадзянскай вайны». (ТАСС).

ПАРАЖЭНЬНЕ ППС У ВІЛЬНІ

Ня гледзячы на страшэнны тэрор з боку польскага фашызму сьвядомасьць працоўных мас Польшчы з кожным днём расьце. Усё трудней становіцца ППС—гэтаму агенту польскага фашызму ашукваць працоўныя масы. Дзякуючы энэргічнай рабоце камуністычнай партыі пралетарыят Польшчы добра ўжо разьбіраецца, хто яго сапраўдны прыяцель, а хто вораг. Таму ня гледзячы на ўсю мнімую апазыцыйнасьць ППС да ўраду і на ўсю яе пацыфісцкую балбатню—пралетарыят Польшчы масамі пакідае рады ППС. «Дзеньнік Віленскі» піша, што ППС у Вільні панесла новае паражэньне. Прафэсыянальны клясавы саюз дворнікаў пастанавіў выйсьці са складу пэпэсэўскай рабочай цэнтралі (акруговай прафсаюзнай арганізацыі).

Прычынай гэтаму зьяўляецца дыктатарскія мэтады кіраўніка цэнтралі раднага Станжэўскага.

Прафэсыянальны-ж клясавы саюз пекароў у Вільні, які да гэтага часу знаходзіўся пад уплывам ППС, далучыўся зараз да ППС-лявіцы і арганізуе новы прафсаюз.

АБ'ЯДНАНЬНЕ ЭНДЭКАЎ У НПР

ВАРШАВА, 26. Перагаворы, якія эндэкі (рэакцыйная партыя прамыслоўцаў і памешчыкаў) даўно ўжо вядуць з жоўтай Нацыянальнай Рабочай партыяй, відавочна скончыліся пасьпяхова. 2-га жніўня адбудзецца канфэрэнцыя абедзьвюх партый для абгаварэньня ўмоў аб'яднаньня. Новай партыі будзе прысвоена наз

Вясковыя ячэйкі КП(б)Б на праверцы

ЧЫСТКА ПАРТЫЙНЫХ ЯЧЭЕК ЯШЧЭ БОЛЬШ ШЧЫЛЬНА ЗГУРТУЕ ПАРТЫЙНЫЯ МАСЫ ВАКОЛ ЗАДАЧ ПА АЖЫЦЬЦЯЎЛЕНЬНІ ГЕНЭРАЛЬНАЙ ЛІНІІ ПАРТЫІ

За шырмай „благополучия"

Што паказала праверка парт'ячэек Заслаўскай арганізацыі

Важнейшай дырэктывы ня выканалі

Арганізацыя да чысткі не падрыхтавалася. Кіраўнікі арганізацыі ў пачатку падрыхтоўкі зрабілі палітычную памылку. Яны забылі, што парт'ячэйкі павінны растлумачыць батрацтву і бяднякам масам вёскі значэньне чысткі. У выніку важнейшая задача ня выканана: ячэйкі нічога не зрабілі па растлумачэньні сялянству задач і прынцыпаў чысткі.

З афіцыйнага боку ўсё было добра. Райпартсход, заслухаўшы даклад аб чыстцы партыі, прыняў рэзалюцыю, у якой «поўнасьцю ўхваліў і далучыўся да ўсіх пастаноў аб чыстцы». Адбыўся пашыраны пленум райкому. На ім сакратары ячэек абмеркавалі практычныя мэтады правядзеньня чысткі. А на мясцох **сяляне, батракі, калгасьнікі ня ведалі аб тым, як будзе праходзіць чыстка.** Ня былі праведзены сходы вясковай беднаты і батракоў. Насельніцтва раёнаў ведала аб чыстцы толькі з тых матар'ялаў, якія друкаваліся ў газэтах. Хаты-чытальні не разгарнулі работы па папулярызацыі сярод сялянства пытаньняў чысткі.

Нарэшце «невялічкая» заўвага — палова парт'ячэек не прапрацавала інструкцыі ЦКК Усе КП(б) аб чыстцы партыі. Агульны вывад ясны: практыка Заслаўскай партарганізацыі можа служыць прыкладам невыстарчальнай падрыхтоўкі да чысткі.

Характарыстыкі скупыя на сапраўднасьць

Райком нядбайна падыйшоў да складаньня характарыстык на ячэйкі. Асобныя **характарыстыкі сапраўднасьці не адпавядалі.** Там, дзе бюро райкому бачыла посьпехі і дасягненьні, там камісія знайшла рад недахопаў. Некалькі фактаў. У старасельскую ячэйку пралезьлі кулакі, заможнікі ў ролі камуністых зрывалі ячэйковую работу. Аб гэтым у характарыстыцы, складзенай райкомам, ні слова.

«Новадворская ячэйка добра праводзіць работу сярод беднаты» — так гаварыла характарыстыка. А ў сапраўднасьці? Ячэйка за ўвесь час **нічога не зрабіла па гаспадарча-палітычнай арганізацыі беднаты.**

У Траскаўскай ячэйцы п'янства ўвайшло ў сыстэму. Характарыстыка маўкліва абыходзіць гэты ганебны факт. Сярод партыйцаў **Жданавіцкай** ячэйкі панавалі склокі. Хвала мяшчанскіх склок і плётак захапіла камуністых. Для райкому такія факты мабыць значэньня ня мелі. У характарыстыцы гэта ня было адзначана.

Ізаляваліся ад батракоў і беднаты

Арганізацыя не расла. У раёне ёсьць некалькі сот с.-г. рабочых і батракоў, сярод якіх ёсьць пэўныя кадры для ўцягненьня ў партыю. І ўсё-ж арганізацыя **за два гады вырасла толькі на... 8 чалавек.**

Чаму?..

Гэта пытаньне зацікавіла камісію. Ячэйкі не праводзілі ніякай культмасавай работы сярод рабочых, батракоў і беднаты. Пры сельсаветах існавалі групы беднаты. Фармальна дырэктывы аб арганізацыі груп беднаты выкананы. Але на справе ячэйкі не праводзілі сталай і сыстэматычнай работы з групамі. У выніку паміж ячэйкамі і групамі няма ніякай сувязі.

Батрацтва было ў загоне. Ячэйкі ня склікалі батрацкіх сходаў. На вачох ячэек кулакі эксплёатавалі батракоў. У асобных выпадках падзённыя рабочыя працавалі па 18-20 гадзін у суткі. Ячэйкі на такія факты не рэагуюць. **Вясковыя партыйцы праходзяць міма інтарэсаў батрацтва.**

Адкрыты сход — рэдкае зьявішча ў рабоце парт'ячэек. Партыйцы ізаляваліся ад беднаты і батракоў. Праводзілі сваю работу закрыта. Дзесяткі батракоў і беднякоў імкнуліся прыняць удзел у грамадзкай рабоце. Але дарма. Выконваць грамадзкую нагрузку мог толькі той, хто меў партбілет. Усю савецкую грамадзкую работу **выконвалі толькі камуністыя. З 7 ячэек так працавалі 5.** Зразумела, чаму арганізацыя не расла. Дырэктывы аб узмацненьні работы з беднатой і ўцягненьні ў рады партыі с.-г. рабочых і батракоў арганізацыя **ў жыцьцё не правяла.**

Рэзалюцыя і сапраўднасьць

Арганізацыя не разгарнула барацьбы з правым ухілам і прымірэнцтвам. Кіраўнікі райкому і ячэек былі ўпэўнены ў тым, што арганізацыя правяла вялікую работу па растлумачэньні апартуністычнай сутнасьці гэорыі правых. У нетрах райкомаўскіх пратаколаў ляжала рэзалюцыя райпартсходу, якая поўнасьцю ўхвалила ўсе пастановы 16-й партканфэрэнцыі. Раённы сход рашуча і аднагалосна асудзіў капітулянцкія тэорыі правых. Партыйцы абавязаліся праводзіць калектывізацыю, змагацца з кулаком, на справе ажыцьцяўляць дырэктывы партыі аб узмацненьні работы з батрацтвам і вясковай беднатой.

А ў сапраўднасьці... **расьлі кулацкія пасёлкі, зрывалася арганізацыя калектыўсаў. Эксплёатавалася батрацтва. Земляўпарадкаваньне праводзілася па прынцыпе «сталыпінскай палітыкі». Кулакі пралезьлі ў каапэрацыю і кіравалі малочнымі таварыствамі.**

У раёне існавала сыстэма эканамічных дагавораў з кулацтвам. Зямля здавалася ў арэнду кулацкім групам, што спрыяла росквіту заможных гаспадарак. Там, дзе на вольных вучастках можна было арганізаваць калгас, там уся зямля здавалася ў арэнду кулаку. Кулацтва аўладала вольнымі зэмфондамі. Дзесяткі гэктараў зямлі, сады, млыны трапілі ў рукі кулакоў. Эканамічны рост кулацкіх гаспадарак быў відавочны.

У вёсцы **Траскоўцы** былі ў наяўнасьці ўсе ўмовы для арганізацыі камуны. Быў вольны фонд у некалькі дзесяткаў гэктараў зямлі з вялікім садам і млыном.

Але ўсё гэта трапіла да кулака, які да рэчы сам здае ў арэнду дзяржаўную зямлю. Гэты факт прайшоў міма траскоўскіх камуністых. **Ячэйкі ня зусім добра зразумелі лінію партыі ў адносінах клясавай барацьбы на вёсцы.** Ячэйкі прымірэнцкі **адносіліся да клясава-варожых элемэнтаў.** Райком не распрацаваў канкрэтнага пляну па калектывізацыі вёскі. Земфонды па **Траскоўскім** і **Старасельскім** сельсаветах пад калектывы не скарыстаны. Землеўпарадкаваньне праводзіў падкулачнік —прыхільнік ідэалаў сталыпінскіх рэформ. Па Траскоўскім сельсавеце земфонд складаецца з 400 гэктараў. З іх толькі 65 скарыстаны на арганізацыю калектыву. Астатнія сотні гэктараў парэзаны на дробныя пасёлкі. Арганізаваны карлікавы калектыў ня мае паўнай эканамічнай базы і пэрспэктыў для росту. Адносіны ячэек да калгасу няўважлівыя.

Заключаным акордам гэтых фактаў могуць служыць злачынствы, якія панавалі ў малочнай каапэрацыі. У праўленьні каапэрацыі сядзелі кулакі, якія на вачох партыйцаў рабілі злачынства за злачынствам. А камуністыя не рэагавалі. Маўчалі. Ведамасьцьвены спакой прытупіў іх клясавую чуйнасьць.

З 100 членаў арганізацыі 20 выключана з партыі

Сярод выключаных ёсьць адказныя працаўнікі вёскі — сакратары ячэек, сельсаветаў і інш.

Вялікі процант выключаных растлумачвае ўсе тыя недахопы і хваравітыя зьявішчы, якія існавалі ў арганізацыі. Склад арганізацыі быў засьмечаны. У кіраўочы актыў уваходзілі «камуністыя», якіх камісіі прышлося выключыць з партыі. Найбольш **здаровай, вытрыманай і згуртаванай аказалася рабочая частка арганізацыі.** Сярод 20 выключаных толькі адзін — рабочы. Камісія правільна і чула падыйшла да ацэнкі кожнага партыйца. **Галоўны крытэрый чысткі — клясавыя задачы партыі праведзены ў жыцьцё.**

Вынікі чысткі лішні раз сьведчаць аб тым, што для вясковай партарганізацыі клясавая аднароднасьць яе радоў мае выключнае значэньне. У арганізацыі, дзе рабочыя і батракі складаюць зусім нязначны процант, дзе няма пралетарскага ўплыву, хутчэй за ўсё магчымы ідэалёгічныя хістаньні, прымірэнцтва да клясавага ворага, скажэньне лініі партыі ў практычнай рабоце і г. д. Вынікі чысткі проста і ясна гавораць аб далейшых задачах партарганізацыі: **арганізацыя павінна павялічыць пралетарскую частку сваіх радоў, расьці стала і сыстэматычна за лік с.-г. рабочых, батракоў, калгасьнікаў і лепшых беднякоў.** У арганізацыі ёсьць вялікія рэзэрвы для росту.

На месца вычышчаных

Рабочыя саўгасаў, батракі і камунары сотні сялян-беднякоў прадэманстравалі на праверачных сходах сваё давер'е партыі, сваю гатоўнасьць актыўна прыняць удзел у сацыялістычнай перабудове вёскі. Масы ўскалыхнуліся. Кадры рабочага і бяднякоў-батрацкага актыву адгукнуліся на заклік камісіі прыняць удзел у праверачных сходах. Там, дзе ячэйкі ня бачылі ніякіх магчымасьцяй працаваць, ніякіх пэрспэктыў для росту, там у сапраўднасьці была нескарыстаная магутная ініцыятыва мас, тах былі кадры, якія хацелі працаваць і не маглі... Закон: «грамадзка-савецкую габоту можа выконваць толькі па спэцыяльных заданьнях партыец»... перашкаджае.

Адразу пасьля чысткі пачалі паступаць заявы аб прыняцьці ў партыю. Дзесяткі батракоў, с.-г. рабочых і камунараў заявілі аб сваім жаданьні ўступіць у КП(б)В.

У саўгасе **Тарасава**, дзе парт'ячэйка не карысталася ніякім аўтарытэтам сярод рабочых і не праводзіла ніякай культмасавай работы, адразу пасьля першага праверачнага сходу камісія **атрымала 8 заяў. 7 лепшых саўгаскіх рабочых з вытворчым стажам ад 10 да 15 год і адна батрачка, якая 12 год працуе па найме, падалі заявы аб прыняцьці ў партыю.** У саўгасе **«Новы Двор»** пасьля дакладу камісіі аб задачах чысткі **4 старэйшыя рабочыя заявілі аб жаданьні стаць членамі КП(б)Б і падалі заявы. На адкрытым сходзе ячэйкі пры Гарадзецкім сельсавеце паступіла 9 заяў аб прыняцьці ў партыю:** 5 — ад рабочых і батракоў і 4 — ад вясковага бяднякага актыву. На месца вычышчаных ужо падало заявы аб прыняцьці ў партыю звыш 30 рабочых, **батракоў, калгасьнікаў і беднякоў.**

Ю. Т.

Падрыхтоўкі ў ячэйках ня відаць

(Дубровенскі раён, Аршанскае акругі)

Прыбыўшы ў раён, праверачная камісія на пленуме райкому зрабіла даклад аб чыстцы радоў партыі. Там быў прыняты дэтальны план работы па праверцы ячэек раёну. У дакладзе, акрамя асьвятленьня агульных прынцыпаў работы па чыстцы членаў партыі, асабліва завастралася пытаньне перад сакратарамі ячэек аб неабходнасьці падрыхтоўкі сялянства да ўдзелу ў праверачных сходах.

Згодна пляну праверачная камісія ў першую чаргу выехала ў станіслаўскую і будоўскую ячэйкі, з якіх і пачала сваю работу па праверцы. Аб выніках і абстаноўцы, у якіх праходзіла работа на праверцы, можна сказаць наступнае:

Апавяшчэньне сялян аб чыстцы, як аказалася, было **праведзена з рук вон дрэнна.** Асабліва нядбайна быў праведзены сход будаўскай ячэйкі. Сакратар Будаўскай ячэйкі, абвяшчаючы аб сходзе, нават не расклеіў абвестак. Беднота на сходзе скардзілася на ячэйку за тое, што ня было своечасова абвешчана аб чыстцы. Камісія, высьвятляючы ў вёсках адсутнасьць падрыхтоўкі, прымушана сама была заняцца гэтым пытаньнем і склікала сход, на сход зьявілася шмат сялян. Яны праходзілі пры вялікім ажыўленьні. Пры праверцы членаў партыі будаўскай ячэйкі—Раманаўскага (старшыня с/с.) і Выдранка, уся беднота ў адзін голас жалілася на нячулыя адносіны гэтых таварышоў да беднякоў, гаварыла аб сыстэматычным п'янстве, неэтычных паводзінах і г. д. Камісія, вывучыўшы паданыя матар'ялы, абагуліўшы думку, выказаную сялянствам на сходзе, члену партыі з 1920 г. **Раманоўскаму** абвясьціла строгую вымову з папярэджаньнем, а члена партыі з 1927 г. **Выдранка** з радоў партыі выключыла. Пастаноўка работы ячэйкі нездавальняючая. Яна на працягу году не абгаварыла такіх пытаньняў, як калектывізацыя, работа з беднатой, работа с.-с., работа сярод жанчын і батрацтва і г. д. На пытаньне, хто з членаў партыі прымацаваны да ячэйкі МОПР'у, сакратар ячэйкі ня мог адказаць.

Усё гэта гаворыць аб тым, што акрамя праверкі радоў партыі, мы павінны ўсебакова праверыць усю работу ячэек, плянавасьць прапрацоўкі пытаньняў, іх якасьць і інш.

Як вынік слабай работы, аказаўся і слабы рост ячэек.

ШАРШНЕЎ.

Забастовачны рух у Францыі

169 забастовак на працягу 1-го месяца

ПАРЫЖ, 16. У чэрвені ў Францыі зарэгістравана 169 забастовак з 101.036 удзельнікамі. У маі было 200 забастовак з 68.000 удзельнікаў. На першым месцы па ліку забастовак стаяць будаўнікі (40.000 бастуючых), за імі ідуць мэталісты (22.690), далей тэкстыльшчыкі (9.500), партовыя рабочыя і докэры (6.000) і інш.

У вялізнай большасьці выпадкаў забастоўкі выкліканы эканамічнымі прычынамі. З 169 забастовак, што адбываліся ў чэрвені 137 выкліканы патрабаваньнямі рабочых аб павышэньні заработнай платы. Рэшта—забастоўкі салідарнасьці, або абароны прафсаюзных праў, 62 забастоўкі скончыліся перамогай рабочых, 19 скончыліся параўнаньнем; рэшта забастовак працягваюцца да сучаснага моманту. (ТАСС).

Частковая перамога парыскіх будаўнікоў

ПАРЫЖ, 24. Лёкаўтаваныя будаўнічыя рабочыя Парыжу атрымалі частковую перамогу. Каля 30 прадпрыемцаў згадзіліся задаволіць усе патрабаваньні рабочых. Унітарны прафсаюз будаўнічых рабочых дазволіў прыступіць да работы на пабудовах гэтых прадпрыемцаў.

Адначасова парыская паліцыя ўзмоцніла рэпрэсіі супроць лёкаўтаваных. Увесь квартал біржы працы, куды кожную раніцу будаўнічыя рабочыя зьбіраюцца на мітынгі, перапоўнен паліцыяй. Паліцыя каля біржы працы затрымала звыш 1.300 рабочых з мэтай праверкі дакумантаў. Пры праверцы было арыштавана 16 рабочых, у тым ліку 6 чужаземцаў, якія былі безадкладна высланы з Францыі. Адбыўся шматлюдны мітынг, на якім будаўнічыя рабочыя пастанавілі працягваць барацьбу

РЫХТУЙЦЕСЯ ДА 1-ГА ЖНІЎНЯ

ершае жніўня—дзень мабілізацыі рэвалюцыйных сіл сусьветнага пралетарыяту — супроць імпэрыялістычнай вайны, супроць буржуазіі і яе прыслужнікаў сацыял-дэмакратаў

Па вуліцах Бэрліну, Парыжу, Вены, Сафіі, Стокгольму, Брусэлю магутны паток пралетараў будзе дэманстраваць сваю гатоўнасьць да клясавых боек!

Першага жніўня пралетары СССР будуць дэманстраваць сваю салідарнасьць з пралетарамі замежных краін, будуць дэманстраваць братэрскае адзінства ўсіх нацыянальнасьцяй СССР. Сацыялістычнае будаўніцтва, якое праводзяць рабочыя і сяляне СССР, моцна б'е па капіталізьме. Наша сацыялістычнае будаўніцтва мае **інтэрнацыянальны характар.** Таму так пільна сочаць за ім капіталісты ўсіх краін. Яны рады кожнаму нашаму недахопу і моцна сьцісканюць зубам, калі даведаюцца аб нашых новых посьпехах. Таму яны стараюцца ўтаіць ад рабочае клясы ўсе нашы перамогі, усе дасягненьні.

Надыходзячы дзень 1 жніўня выклікаў сярод замежных рабочых хвалю энтузіязму, хвалю братэрскай салідарнасьці з рабочай клясай СССР. Буржуазія ўсімі сродкамі стараецца пакалець рабочай клясе «жахі савецкага лада». Вось што пішуць нам нашы замежныя таварышы, прысылаючы нам свае лісты на мове эсперанто.

Паслухмяные сабакі капіталізму

«У апошні час у зьвязку з падрыхтоўкай да 1-га жніўня і з разрывам дыплёматычных зносін з СССР—павялічыўся напад на Сав. Саюз у буржуазнай і сацыял-дэмакратычнай прэсе,—піша нам гамбургскі рабочы **Курт Лібэр.**—Гэта робіцца для таго, каб адвесьці рабочых ад удзелу ў першажніўневых стачках, забастоўках, дэманстрацыях. Цяпер, чытаючы газэту, цяжка нават сказаць: буржуазная яна—ці сацыял-дэмакратычная. Хіба толькі розьніца ў тым, што сац.-дэмакратычныя газэты больш рэзка і азьвярэла нападаюць на Сав. Саюз, чымся якая-небудзь капіталістычная газэтка. І гэтыя газэты яшчэ лічаць сябе зьвязанымі з рабочай клясай. Гэта ў іх супрацоўнічае вядомы літаратурны і палітычны ветрагон Леў Троцкі. Яго артыкулы дышуць злобай супроць Сав. Саюзу. Лепей бы было гэтым газэтам і пісакам напросту зьмяніць назвы, каб маральна не забруджваць ідэю сацыялізму. Гэта дзякуючы (ці-ж сапраўды за гэта трэба **так** дзякаваць!) сац.-дэмакратычным прыслужнікам, у нас забаронены ўсякія дэманстрацыі. І нават і жніўня нам не дазволена выйсьці на вуліцу.

Але,—піша далей К. Лібэр,—мы маем добры прыклад першамайскага выхаду на вуліцу бэрлінскіх рабочых і мы па іх прыкладу выйдзем на вуліцу пад лёзунгамі: прэч імпэрыялістычныя войны, прэч здрадніцкую палітыку сац.-дэмакратычных правадыроў. За СССР—нашу бацькаўшчыну.

„На выходзьце на вуліцу, бо будзем страляць"

Так перасьцярагаюць рабочых ад выхаду на дэманстрацыю ў Сафіі, аб гэтым піша наш сафійскі таварыш **І. Бат.** —«Я пісаў ужо вам, як паліцыя рыхтуецца да 1 жніўня. Цяпер я нашшу аб новых фактах. Рабочыя ўжо ўсё ведаюць аб сваіх задачах у дзень 1 жніўня—яны ўсе, як адзін, павінны ў абед кінуць свае варштаты і выйсьці на вуліцу. Выдана ўжо шмат лістовак да гэтага дня. Але, учора быў агалошаны загад сафійскага Цэргібэля—аб тым, што і жніўня забараняюцца сходы і дэманстрацыі. А па фабрыках, заводах і ўстановах будзе праведзен вучот тых таварышоў, што не зьявіліся на працу. Іх потым абавязкова зволяць. Начальнік паліцыі раіць лепш і носа не паказваць на вуліцу Гэты загад быў спаткаць рабочымі з вялікім абурэньнем. Ня гледзячы на арышты і кулі, рабочыя ўсе роўна выйдуць на вуліцы. Не застрашыць нас узброеная паліцыя, якая ўжо месяц рыхтуецца да боек з намі. Мы выйдзем без аружжа, каб дэманстраваць сваю салідарнасьць з СССР —супроць вайны. Кампартыя ўжо даўно ў нас загнана ў падполье. Цяпер баўгарскія шыбельнікі хочуць туды загнаць увесь рабочы рух! Будзем змагацца!»

За краіны саветаў—сьцяна рабочых і сялян

— Мо крыху лепш абстаіць справа ў нас, у Вене,—піша рабочы мэталіст **Рот,**—перасылаючы нам аднячасова ліст баўгарскага таварыша. І ў нас паліцыя рыхтуецца да змаганьня з намі, і нашы венскія Цэргібэлі рыхтуюць крывавую сустрэчу рабочым. Магутная падрыхтоўчая дэманстрацыя, якая адбылася нядаўна ў Вене, прайшла з вялікім уздымам. На мітынгі ахвяр 14 ліпеня ходзілі тысячы пралетараў. Што асабліва трэба адзначыць, так гэта клясавую сьвядомасьць рабочых, якая ўсё ўзьнімаецца. Гэтаму дапамагалі многа сац.-дэмакраты, якія сваёй палітыкай паказалі свой сапраўдны твар. Сацыял-дэмакраты выбралі лепшае для іх—добрыя міністэрскія партфэлі і крэслы і зусім забылі пра рабочых. Рабочыя забываюць ужо пра іх, бо яны практычна ні чым ня могуць дапамагчы рабочым. Беспрацоўе расьце. Расьце цана і на прадукты, а зарплата зьмяншаецца. Надыходзіць час крызісу капіталізму. Таму яна шалёна рыхтуе расправы з рабочымі. Усе яе стрэлы і жаданьні накіраваны супроць СССР, якая адна на ўсім сьвеце, як думаюць яны, насаджае бальшавізм. Ні спробы Чан-Кай-Шы, ні спробы іншых, хто хоча выклікаць вайну, ня будуць мець посьпеху. За СССР—краінай Саветаў—стаіць сьцяна рабочых і сялян з замяжы, якія не дазволяць чапаць СССР!

Пралетары Скандынавіі супроць вайны

«Можа ў дзень, калі дойдзе да вас гэты ліст, вы ўжо будзеце мець тэлеграфныя весткі аб супрацьваенным скандынаўскім кангрэсе, які адбудзецца ў Гэтэборгу. Гэты кангрэс мае мэтай падрыхтаваць рабочыя масы Скандынавіі да надыходзячых бояк. Ужо колькі разоў буржуазія правакавала, выклікала СССР на вайну, а вайна з СССР гэта пачатак вялікай сусьветнай імпэрыялістычнай вайны. Гэтэборская акруга зьяўляецца самай перадавой у Швэцыі і наогул у Скандынавіі, таму і ў Гэтэборгу вызначана адчыненьне кангрэсу, які зьявіцца першым крокам нашай агульнай дэманстрацыі супроць вайны. Гэтэборскія пралетары ішлі і будуць ісьці ў агульных радох сусьветнага пралетарыяту,—піша так рэдактар Гэтэборскай камуністычнай газэты—**Эйнар Адамсон,** наведаўшы Менск на сьвята X годзьдзя СССР.

Прывітаньне з далёкай Аргэнтыны

«Пралетары далёкай Аргэнтыны,—піша **А. Барыё**—рабочы аргэнтынскіх плянтацый,—некалькі год былі зусім адарваны ад жыцьця Сав. Саюзу. Яны ня ведалі нічога аб СССР, акрамя той хлусьні, якую чыталі кожны дзень у замежных эўрапейскіх буржуазных газэтах. Цяпер кальцо блёкады прарвана, аргэнтынскія рабочыя больш ведаюць аб СССР. У Аргэнтыне ёсьць свая кампартыя, якая выдае газэту, у якой шмат пішацца аб СССР.

У нас таксама пачалася падрыхтоўка да супрацьваеннага дня. Мы ўпэўнены, што і наш голас—«прэч вайну»—будзе чуцён 1 жніўня ў агульным сугучным галасоў пралетараў усіх краін. Аргэнтынскія рабочыя мала ведаюць аб імпэрыялістычнай вайне, але ў некаторых сем'ях добра памятуюць аб тых сыпох і братох, якія загінулі недзе ў невядомых краінах, абмацута вывезеныя ў наюючыя армії».

Рабочыя Афрыкі далучаюць сво голас пратэсту

І яшчэ адзін ліст, праўда, вельмі кароценькі. Гэта і ня ліст, а толькі некалькі слоў, напісаных на паштоўцы, атрыманай з далёкай **Паўднёвай Афрыкі** ад **т. Д. Дашбэ.** «Пратэстуючы супроць імпэрыялістычных войн у дзень 1 жніўня далучэце і наш голас пратэсту да агульнага пралетарскага супрацьваеннага пратэсту. Мы пакуль ня так моцны, каб арганізаваць супрацьваенную дэманстрацыю па вуліцах Ютанэзбургу. Але тысячы чорных і белых нявольнікаў капіталізму—супроць вайны.

Наша братэрская прывітаньне СССР —першаму магутнаму супрацьваеннаму атраду».

***

— Вось некалькі з тых лістоў, што прынесла сёньня пошта. Напісаныя адной мовай—яны расказваюць нам аб адзіным фронце пралетараў усяго сьвету. Засталося ўжо некалькі дзён да 1 жніўня. Засталося некалькі напружаных дзён падрыхтоўкі для замежных таварышоў.

1 жніўня рабочыя выйдуць на вуліцы з лёзунгамі: **Прэч вайну! Рукі прэч ад СССР!**

ЗЬМ. СЬНЕЖКА.

Лепшы адказ ворагу

ПЕРАДАВЫЯ РАБОЧЫЯ УСТУПАЮЦЬ У ПАРТЫЮ ЛЕНІНА

Падрыхтоўка да 1-га жніўня выклікала творчую ініцыятыву мас

Падрыхтоўчая праца да 1 жніўня праходзіць вельмі пасьпяхова. Вакол задач і лёзунгаў Міжнароднага Чырвонага Дня згуртавана ўся ўвага пралетараў нашай краіны. На правакацыю вайны рабочыя адказваюць большым удзелам у сацыялістычным спаборніцтве, рэалізацыяй 3-яй пазыкі індустрыялізацыі і ўзмоцненай падрыхтоўкай да абароны краіны.

На правакацыю імпэрыялістых менскія рабочыя адказваюць масавым уступленьнем у партыю Леніна.

На заводзе «Энэргія» у часе сходаў і мітынгаў па цэхах па пытаньні падрыхтоўкі да МЧД, рабочыя даказалі сваю гатоўнасьць абараняць заваёвы Кастрычніка, даказалі сваю салідарнасьць з міжнародным пралетарыятам: **25 лепшых перадавых рабочых, байцоў з фронту сацыялістычнага спаборніцтва з найбольшым вытворчым стажам падалі заявы аб уступленьні ў партыю.** Гэтым яны выказалі партыі поўнае давер'е ў справе сацыялістычнай перабудовы краіны і салідарнасьці з пралетарамі ўсяго сьвету ў падрыхтоўцы да Міжнароднага Чырвонага Дня.

На заводзе «Камунар» у часе мітынгу рабочых усяго заводу ад **31 рабочага паданы заявы аб уступленьні ў партыю.**

Заявы поўны адвагі клясавай салідарнасьці. На абодвых гэтых заводах адбудуцца спэцыяльныя ўрачыстыя вечары партыйных ячэек з шырокім удзелам рабочых па пытаньні прыёму ў партыю.

Мы наведалі амаль усе цэнтральныя праўленьні прафсаюзаў Беларусі. На ўсіх пізавых зьвезьнях прафсаюзаў шырока разгарнулася падрыхтоўчая праца. На ўсіх прадпрыемствах і на ўстановах за малым выключэньнем праведзена належная падрыхтоўча-растлумачальная праца, скарыстаны абедзеньня перапынкі для гутарак, цэхавых сходаў, мітынгаў, агульна-заводзкіх сходаў. З 27 ліпеня пачынаюць адбывацца агульна-масавыя вечары з дакладамі аб МЧД і нашых задачах у справе абароны здольнасьці краіны на ўсіх прафсаюзах. Так, саюз **будаўнікоў** наладжвае вялікі сход у доме «Культуры», дзе з дакладам выступіць тав. Ігнатоўскі.

Саюз сауґандльслужачых ужо правёў 26 ліпеня мітынг усіх членаў свайго саюзу на г. Менску. На саюзе мэдсанпрацы акрамя гутарак па ўсіх лекавых установах пастаўлены пэрасованыя дошкі, на якіх наклейваюцца выразкі з газэт па пытаньні падрыхтоўкі да МЧД. Саюзы: мэдсанпрацы, сувязі, асьветы, саўгандльслужачыя 28 ліпеня наладжваюць паходы ў падшэфныя вайсковыя часьці, дзе адбудуцца мастацкія вечары сумесна з чырвонаармейцамі, спаборніцтва на стральбе і інш. Да ўдзелу ў паходах уцягваюцца члены прафсаюзаў і іх утрыманцы. У радзе асобных прадпрыемстваў пабудаваны выстаўкі вайсковай літаратуры і інш.

Па саюзе сувязі 200 працаўнікоў набылі процігазы для вайсковай падрыхтоўкі. Падрыхтоўка да МЧД зьвязваецца з падпіскай на 3-ю пазыку індустрыялізацыі.

Але, сярод саюзаў ёсьць і такія, што да падрыхтоўкі аднесьліся казённа, далі дырэктывы і гэтым абмежаваліся. Мы ўпэўнены, што рабочыя гэтых саюзаў прымуць актыўны ўдзел у дэманстрацыі, ня гледзячы на марудную падрыхтоўку свайго цэнтральнага праўленьня саюзу.

Разам з шырокай растлумачальнай працай ідзе падрыхтоўка да карнавалу, які арганізоўвае 28 ліпеня Асоавіяхім.

Саюз працаўнікоў мастацтва сумесна з падшэфнай артылерыйскай часьцю таксама наладжвае багаты карнавал, які павінен паказаць шалёную падрыхтоўку імпэрыялістых да вайны.

***

У сувязі з тым, што сьвяткаваньне 1 жніўня адбудзецца ў працоўны дзень, рабочыя заводу «Энэргія» вынесьлі пастанову працаваць у суботу 28 ліпеня замест 6 гадзін 8 гадзін з тым разлікам, каб 1 жніўня працу закончыць на 2 гадз. раней і гэтым даць магчымасьць больш часу патраціць на дэманстрацыю і мітынг.

УЛ. СТРЫГОЦКІ.

Працоўныя жанчыны супроць вайны

24 ліпеня ў клюбе імя К. Маркса адбыўся масавы сход працоўных жанчын г. Менску. На вечары адчувалася асабліва зацікаўленасьць і актыўнасьць жанчын. Яны прышлі пратэставаць супроць новай вайны, якую хочуць навязаць працоўным капіталістыя.

800 працоўных жанчын-актывістак, заслухаўшы даклад тав. **Славінскага** і прадстаўніка ад польскай сэкцыі МОПР'у т. **Добравольскага,** з абурэньнем сустрэлі паведамленьне аб налёце кітайскіх бандытаў. Адна за другой уваходзяць на трыбуну працоўныя жанчыны:

— Мы вайны ня хочам, добра яшчэ памятаем вайну 14 году...

— Але, усе мы павінны навучыцца трымаць стрэльбу і рыхтавацца да рашучага адпору буржуазіі, якая гатуе напад на бацькаўшчыну працоўных—савецкую краіну.

Выступаючыя заклікаюць усіх працоўных жанчын падпісацца на 3-ю пазыку індустрыялізацыі. Гэтую прапанову сустракаюць гучнымі воплескамі.

У рэзалюцыі, якая аднагалосна прынята, гаворыцца:

«Шалёны ўзрост узбраеньня імпэрыялістычных дзяржаў, арганізацыя новых ваенна-палітычных саюзаў, заключэньне тайных дагавораў, рост ваенных бюджэтаў,—усё гэта паказвае, што імпэрыялістыя рыхтуюцца да новай сусьветнай бойні.

Агульна-гарадзкі сход работніц і жонак рабочых, лічачы, што ня толькі будаўніцтва сацыялізму зьяўляецца часткай сусьветнай рэвалюцыйнай барацьбы, заклікае ўсіх жанчын гораду і вёскі да няўхільнага выкананьня пяцігадовага пляну нашага сацыялістычнага будаўніцтва.

У адказ на бандыцкі захват К.-Усх. чыгункі кітайскім урадам агульна-гарадзкі сход заклікае ўсіх работніц падпісацца на 3-ю пазыку індустрыялізацыі і калектыўна здаць на хаваньне аблігацыі 2-й пазыкі.

Улічваючы рост ваеннай небясьпекі, агульны сход лічыць неабходным узмацніць працу на ваенізацыі жанчын.

Гучнымі воплескамі сустракаецца заклік прадстаўніка акругкому МОПР'у да ўсіх жанчын прыняць удзел у мопраўскім карнавале 28 ліпеня.

Аднагалосна прымаецца прапанова аб пасылцы ліста ад жаночага актыву работніцам і сялянкам Нямеччыны і Заходняй Беларусі.

На масавым мітынгу друкароў

У летнім садзе друкароў каля 800 рабочых і служачых-мопраўцаў друкарні БДВ, друкарні і рэдакцыі «Зьвязда», падсобных майстэрняў БДВ, канторы выдавецтва РСФСР, «Известия ЦИК» і «Правда»—сабраліся заслухаць даклад аб МЧД. Пасьля дакладу палітэмігранты т. Жук і Карповіч выступілі з успамінамі.

Сход прыняў наступную рэзалюцыю: «У адказ на наглыя выпады буржуазіі яшчэ больш узмацнім абароназдольнасьць савецкай краіны. Пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі ажыцьцявіць усе мерапрыемствы савецкай улады па індустрыялізацыі краіны, па выкананьні пяцігадовага пляну будаўніцтва. Мы заклікаем працоўных БССР паскорыць калектыўную здачу аблігацыі 2-й пазыкі індустрыялізацыі на хаваньне ў ашчадкасу. Мы, друкары, далучаемся да прапановы ленінградзкіх рабочых—лічыць 6 жніўня днём індустрыялізацыі. Заклікаем працоўных усяго сьвету ў дзень 1-га жніўня выйсьці на вуліцу для пратэсту супроць новай імпэрыялістычнай вайны і нападу на СССР. Мы заклікаем усіх працоўных БССР уступіць у рады МОПР'у—школы пралетарскай салідарнасьці і заўсёды аказваць матар'яльную дапамогу ахвярам фашызму.

Інсцэніроўка бэрлінскіх падзей

Працоўныя Аршаншчыны з энтузіязмам рыхтуюцца да Чырвонага Дня. Праведзены масавыя сходы працоўных, парады, на якіх папулярызаваліся лёзунгі Камінтэрну і чарговыя задачы нашага сацыялістычнага будаўніцтва. Працоўныя Аршаншчыны разам з усім пралетарыятам у дзень 1-га жніўня пакажуць сваю цьвёрдую рашучасьць непераможнай сьцяной стаць на абарону СССР.

27-га ліпеня адбудзецца масавы выхад працоўных г. Воршы у лягэры, 30 ліпеня адбудзецца інсцэніроўка разгону першамайскай дэманстрацыі ў Нямеччыне. Інсцэніроўка пакажа змаганьне рабочых у капіталістычных краінах за мір і абарону СССР.

АСМАЛОЎСКІ.

БЕЛЫ ТЭРОР У БАЎГАРЫІ

Катаваньні ў баўгарскіх засьценках

Адкрыты ліст Млядэна Стаянава да прэм'ер-міністра Ляпчэва

У адным з апошніх нумароў «Ретэ Фанэ» зьмясьціла адкрыты ліст былога члена ЦК баўгарскае кампартыі Млядэна Стаянава баўгарскаму прэм'ер-міністру Ляпчэву. «Пане міністар,—піша Стаянаў,—20-га сакавіка я быў арыштаваны вашай паліцыяй, як член ЦК кампартыі Баўгарыі. У паліцэйскай управе мяне фізычна і маральна катавалі такімі спосабамі, якія нельга параўнаць па сваёй лютасьці з сярэднявяковымі. Няма ніякага сумненьня, што страшэнная інквізіцыя, якую спрабавалі і іншыя арыштаваныя камуністыя, робіцца з вашага ведама і згоды. Калі я апісваю тут перанесеныя мною мукі, дык раблю гэта не для вас, а ў інтарэсах працоўных і ўсіх сумленна-думаючых людзей, якія павінны ведаць, як тут катуюць рабочых».

«У турме,—піша Стаянаў,—з мяне ўвесь час зьдекваліся, пагрозы сыпаліся без канца, у той час, як з суседніх пакояў чутны былі жахлівыя крыкі катуемых камуністых.

«Мяне,—піша Стаянаў,—13 разоў катавалі да таго часу, пакуль я ня страціў памяці. Мяне білі па твары, білі кулакамі, білі галавою аб сьцену, вырывалі вал

ЦІ ТРЭБА ЛІКВІДАВАЦЬ НАРКАМЮСТ?

(У парадку абгаварэньня)

Адным з буйнейшых тормазаў на шляху спрашчэньня работы апарату, як ужо даўно даведзена, зьяўляецца касьцасьцю, боязьнь перамен, якія пануюць унутры самога апарату. Гэта боязьнь тлумачыцца большай часткаю нястолькі наўмысным нежаданьнем зьмен, колькі сілаю прывычкі, якая выклікае пэўны кансэрватызм. У нас частка ня хоча зразумець, што сама форма апаратаў таксама азначаецца налічнымі грамадзкімі адносінамі. Паколькі апошнія зьмяняюцца, настолькі павінен зьмяняцца ня толькі зьмест работы органаў кіраўніцтва, але і сама форма іх. Гэта адносіцца ня ўменшай меры і да работы суду.

У адносінах зьместу нашых законаў, наш суд арабіў паварот, у параўнаньні з буржуазным судом, на 180 градусаў. Буржуазны закон абараняе інтарэсы капіталістых, наш закон абараняе інтарэсы працоўных. Вэрлінскі суд, напрыклад, выгараджвае белагвардзейца Арплова, выяваляе забойцу Лібкнэхта, затое засуджвае на шматмесячнае зьняволеньне рабочага—толькі за ўдзел у дэманстрацыі.

Наш суд пасадзіць у турму кулака за эксплёатацыю батрака, расстраляе белагвардзейца за актыўную барацьбу супроць рабочае клясы будзе абараняць свабоду і інтарэсы рабочых. Тут поўная процілеглась. Але ў адносінах формы мы ўсё яшчэ моцна трымаемся старых традыцый. Гэта і адлюстравалася ў артыкуле «Як палепшыць работу судовага апарату» у № 167 «Зьвязды».

Аўтар артыкулу перш за ўсё баіцца, што з прычыны ліквідацыі НКЮ, як самастойнага апарату, стваральная два самастойных наркаматы: пракуратура і вярхоўны суд. Ці страшна гэта? Ні ў водным з акруг Беларусі няма самастойнага органу юстыцыі. Ёсьць акруговы суд і пракуратура. А між тым, там няма ніякага паралелізму і абсалютна ніякай патрэбнасьці ў лішнім органе, які выконвае іх работу. На пленумах акрсуду абгаварваюцца прынцыповыя пытаньні і пытаньні практычнага характару. Гэтага аўтар ніяк ня хоча дапусьціць для ўсёй рэспублікі. Між тым, калі, як прапануе брыгада на агляду, склад пленуму Верхсуду папоўніць прадстаўнікамі РСІ, прафсаюзаў, ЦВК, дык абсалютна няма чаго баяцца ні аднабоканасьці пастаноў пленуму, ні лішняй самастойнасьці работы пракуратуры і Верхсуду, ні асаблівай незалежнасьці суду. Незалежных судоў наогул на сьвеце няма. Кожны суд зьяўляецца чыёй клясы. Францускі суд саджае за турму рэдактароў камуністычных газэт таму, што ён зьяўляецца зброяй францускае буржуазіі. Амэрыканскі суд выносіць Сако і Ванцэці на электрычнае крэсла таму, што ён зьяўляецца зброяй амэрыканскіх мільянэраў. Але хіба нынешнасьць гэтых судоў не азначаецца наліччам галоўным чынам, міністэрства Юстыцыі (ды ў Амэрыцы яго, здаецца, і няма)? Не, яны азначаюцца, галоўным чынам, самімі судзьдзямі, самімі пракурорамі, якія зьяўляюцца прадстаўнікамі буржуазных кляс і, абараняючы інтарэсы гэтае клясы, абараняюць і свае інтарэсы. Апошнія дасканала ведаюць «лінію» свайго буржуазнага ўраду і ўмеюць гэту лінію ў рабоце праламляць. Калі пракуратура рэспублікі і Верхсуд добра будуць ведаць і праламляць лінію сваёй пралетарскай клясы, свайго пралетарскага ўраду, а правільнасьць праламленьня гэтай лініі далёка не азначаецца наліччам прыдатку ў асобе НКЮ, то клясавасьць, залежнасьць суду ад клясавых інтарэсаў пралетарыяту будзе забясьпечана. І іменна яна будзе больш забясьпечана тады, калі ў вызначэньні лініі работы суду будзе ўдзельнічаць на пленуме і прадстаўнік РСІ, і прадстаўнік прафсаюзаў, і прадстаўнік савецкіх органаў, і пракуратура, і Верхсуд. А зараз нагляд за гэтай работай зьяўляецца фікцыяй, бо НКЮ, які непасрэдна работы гэтай ня робіць, ня можа прасачыць за гэтай работай, і яго дзейнасьць ў гэтым кірунку зводзіцца толькі да пасылкі абежнікаў. Такім чынам, і боязнь паралелізму, і боязнь незалежнасьці адпадае. Няправільны таксама, па думцы брыгады, і той довад, што пры вырашэньні пытаньняў на пленумах Верхсуду гэта адбярэ ў пракуратуры нагляд над судом. Практыка акруг абвяргае гэта. Гэта папершае. Падругое, пры цяперашнім становішчы рэчаў стваральная ўжо два органы нагляду: наглядае пракуратура, наглядае і НКЮ. Словам, Вярхоўны суд ператвараецца ў орган, за якім наглядаюць 2 нянькі: адна малодшая і адна старэйшая. Брыгада лічыць, што абгаварэньне пытаньняў і спрэчных момантаў на пленумах Верхсуду (у папыранным складзе) ані ня зьменшыць наглядальных функцый пракуратуры, тым больш, што і зараз, у выпадку разгалоўся паміж пракурорам і калегіяй Верхсуду, пытаньне пераносіцца не ў НКЮ, а на пленум Верхсуду. Пры гэтым спрэчкі па асобных рашэньнях маглі-б пераносіцца на звычайны пленум, а на прынцыповых пытаньнях —на папыраны.

Застаецца адзін матыў для захаваньня НКЮ, як самастойнага апарату, гэта яго фінансава-гаспадарчыя функцыі. Мы сумневаемся, каб усе гэтыя функцыі выконваў (як гэта адзначана ў артыкуле) адзін нарком. Нарком толькі наглядае, і гэты нагляд зусім можа выканаць старшыня Вярхоўнага суду. Але, нарэшце, справа не ў скарачэньні наркома. Справа ў перанясеньні інспэктарскіх функцый НКЮ і кансультацыйнага апарату ў Вярхоўны суд, што значна палепшыць нагляд за нізавым апаратам. А, калі гэта будзе зроблена, тады захаваньне НКЮ толькі як фінансава-гаспадарчы апарат страціць сэнс.

Другое спрэчнае пытаньне,—гэта аб тым, каму павінен быць падпарадкаваны сьледчы апарат: пракурору або суду? Аўтар артыкулу ня мае рацыі, калі піша аб тым, што суду будзе цяжка справіцца са справаю кіраўніцтва допытам. Што мы маем зараз у раёнах? Орган допыту ёсьць у кожным раёне. А вось сьледчы і памп ракурора прыпадае нярэдка адзін на 3 раёны. Яго кіраўніцтва допытам вызначаецца ў прысылцы папер і прыездах на месца раз ў 3-4 месяцы, а то і ў паўгода. Сьледчы нават часта ня ў курсе таго, што робіцца ў раёне і рэагуе на зьявішчы толькі тады, калі да яго паступае справа або заява. Між тым суд і міліцыя, працуючы ў адным раёне, пастаянна зьвязаны ў сваёй рабоце. Нарэшце і кіраўніцтва пракуратурай допытам вельмі праблематычна з тае-ж паказанай прычыны. Тыя функцыі па кіраўніцтву, якія пракуратура і сьледчы выконваюць на адлегласьці часам 30-50 вёрст, суд без затрудненьня мог бы выканаць, будучы зьвязаны з міліцыяй на месцы.

Калегіяльнасьць суду таксама ніякае перашкоды ў кіраўніцтве яго сьледчым апаратам ня можа прадстаўляць. Суд зьяўляецца калегіяльным органам пры разглядзе судовых спраў, пры вынясеньні прыгавораў, але ніколі, наколькі нам вядома, ніводзін акрсуд калегіяльна ня кіруе нізавымі судамі і апаратам суду, які ў акругах далёка немалы.

Адсюль відаць, што калегіяльнасьць суду ніколькі не перашкаджае яму выконваць адміністрацыйныя і іншыя функцыі, і не перашкодзіць яму, зразумела, кіраваць і сьледчым апаратам.

Нарэшце, і боязьнь таго, што пракурор ня здолее выконваць барацьбы са злачынствамі, калі ў яго адбяруць сьледчы апарат, неўгрунтаваная. Іменна тады, калі за пракурорам будуць пакінуты толькі функцыі нагляду і судовага і сьледчага апарату, калі ён ўхіліцца ад папярэдняга кіраўніцтва, калі ўзмоніць жывую сувязь і жывое кіраўніцтва, барацьба са злачынствамі будзе пастаўлена на належную вышыню. Тады помпракурора будзе аб'яжджаць свае 3-4 раёны не адзін раз у 5-6 месяцаў, а ня менш і разу ў месяц, і рэвалюцыйная законнасьць ад гэтага выйграе.

А. ВАЙЦОК.

1.800.000 рублёў ад самаабкладаньня ляжаць бяз руху

787.000 рублёў—нядоімак

Агітаваць за самаабкладаньне фактамі

З кастрычніка - лістапада мы пачнем рыхтавацца да самаабкладаньня 1929-30 г. Пэрспэктывы здавальненьня культурна-гаспадарчых патрэб вёскі, бязумоўна, пашыраюцца і гэта трэба ўлічваць. Але для посьпеху будучага самаабкладаньня, трэба добра закончыць сёлетняе. Ніяк нельга чакаць згоды сходу на самаабкладаньне будучага году, калі з прынятых сёлета 1.000 руб. сыскана 500, а скарыстана па прызначэньні толькі 100 руб. А такіх прыкладаў шмат.

Значная частка самаабкладаньня, прынятага сялянствам у лютым-сакавіку, не паступіла да гэтага часу. Па тэстках на 15-VII ў нядоімцы застаецца 787 тысяч рублёў, амаль адна трэцяя частка прынятых сум. Менская акруга здолела не дабрацьць 40 проц., а Гомельская — нават 56 проц. самаабкладаньня. Зразумела, пры гэткіх ліччбах ніяк нельга прызнаць здавальняючым працу гэтых акруг і магчымасьці будучага самаабкладаньня: бо той, хто своечасова заплаціў сваю частку (бедната, серадняк), мае права прыўдзіцца за дапушчэньне нядоімкі на іншымі; а недаімшчыкі (заможнік, кулак) будуць замацоўваць свае пазыцыі і зрываць справу на будучы час.

Ім больш, што нават па самаабкладаньні 1927-28 г. да гэтага часу ліквідавана нядоімкі звыш 300 тыс. руб. Мільён з лішкам недабору самаабкладаньня азначае шмат непабудаваных школ, не адкрытых мэдпунктаў, не набытых супроцьпажарных машын і іншых рэчаў, якіх так настойліва патрэбуе бурны культурны ўздым вёскі.

Ліквідацыя нядоімачнасьці па самаабкладаньні — павінна стаць цяпер у асяродку ўвагі акруговага і раённага апарату. Падлік аб'ектаў сельгаспадатку скончыўся, сілы сельсавецтаў вызваліліся ад гэтае напружанае працы; з другога боку — надыходзіць сеньняя сяўба, спагнаньне першае раты сельгаспадатку, а далей—падрыхтоўка да будучага самаабкладаньня і рад іншых кампаній. **Таму трэба рашуча дабіцца спагнаньня нядоімак да пачатку верасьня гэтага году.** Паколькі гэтае справы трэба арганізаваць грамадзкасьць і мабілізаваць усе сілы апарату.

На адным камандаваньні сельсавецтамі далёка не заедзеш. **РВК павінны прыняць беспасрэдны ўдзел у спагнаньні самаабкладаньня, растлумачваць сялянству сэнс гэтае справы, прыцягваць да строгае адказнасьці злаўмысных заможных недаімшчыкаў і нядбайных сельсаветчыкаў.** Побач з тым трэба скарыстаць формы грамадзкага ўплыву: арганізацыю спаборніцтваў па ўносах самаабкладаньня, агалашэньне сьпісаў недаімшчыкаў і г. д.

Яшчэ больш важна хутка і правільна скарыстаць сабраныя сродкі. Тут становішча асабліва дрэннае. **Амаль 500 тысяч рублёў самаабкладаньня 1927-28 г. і звыш 1.300 тыс. рублёў сёлетняга ляжаць бяз руху, першыя**— больш году, другія — некалькі месяцаў. Па мэтавым прызначэньні скарыстана толькі 24 проц. сёлетняга самаабкладаньня і нават на лешай Аршанскай акрузе скарыстана толькі 36 проц. паступіўшых сум. Некаторыя працаўнікі спасылаюцца на «аб'ектыўныя ўмовы» — няма тэхнічных сіл, сельсаветы не падрыхтаваны, не хапае патрэбных машын, мэты самаабкладаньня нерэальныя і т. д. Але ўсё гэта можа апраўдаць толькі нязначную частку недапушчальнае цяганіны. Нярэальныя мэты самаабкладаньня можна была даўно пераглядзець, тэхнічныя сілы знайсьці і паняць, патрэбныя машыны загадзя забясьпечыць.

Таму мы прапануем разглядаць як нядбайнасьць і караць у судовым парадку за нескарыстаньне сродкаў самаабкладаньня 1927-28 г. Непадрыхтаванасьць некаторых сельсаветаў райвыканкомы павінны ўлічыць шляхам актыўнае дапамогі ім, пасылкі тэхнічных сіл, складаньня каштарысаў і т. д. Да канца будаўнічага сэзону ўсе сумы самаабкладаньня, якія ўжо паступілі і паступяць цяпер, павінны быць поўнасьцю выдаткаваны па прызначэньні. Акруговыя і раённыя выканаўчыя камітэты павінны зьвярнуць самую пільную ўвагу на гэты бок справы. Бо нельга спадзявацца на будучае самаабкладаньне ў тых вёсках, дзе яшчэ не скарыстаны і сёлетнія сумы.

Наадварот, паказаўшы сялянству на справе карысьць самаабкладаньня, ня прыдзецца асабліва і агітаваць за яго. Агітаваць будуць факты накшталт школ, больніц, супроцьпажарных абозаў і інш.

М. К.

Па Савецкай Беларусі

Перад прызывам

Гомель (наш кар.). Прызыўныя камісіі закончылі вызначэньне ільгот прызыўнікам. У бліжэйшы час будуць праведзены санфэрэнцыі прызыўнікоў.

Галоўвыстаўком не дае інструкцый

Ворша (наш кар.). Ня гледзячы на тое, што акруговы і раённыя камітэты па падрыхтоўцы ўсебеларускай выстаўкі арганізаваны ўжо даўно, яны яшчэ да гэтага часу ня могуць прыступіць да працы, бо Галоўвыстаўком ня прыслаў яшчэ налажэньня аб выстаўках і ня даў ім ніякіх указаньняў, што трэба рабіць.

Акрвыканком, у сувязі з гэтым, давёў да ведама СНК БССР аб бязьдзейнасьць Галоўвыстаўкома.

Спаборніцтвы на датэрміновую здачу падатку

Гомель (наш кар.). Сяляне пачалі атрымліваць акладныя лісты. У некаторых раёнах акругі сялянства датэрмінова уносіць с.-г. падатак. У Веткаўскім раёне абвешчана спаборніцтва паміж сельсаветамі на арганізацыю датэрміновай здачы падатку.

Будуюцца 4 вапенныя заводы

Гомель (наш кар.). Канчаецца пабудова 4-х вапенных заводаў. На фабрыцы «Гэрой Працы» ўжо пераапрацавана 20 тысяч пудоў вапны. Вапнянае ўгнаеньне будзе разаслана па ўсіх вёсках акругі.

Перад рэарганізацыяй апарату Віцебшчыны

Першыя крокі ўрадавайкамісіі

(Ад нашага віцебскага карэспандэнта)

24-га ліпеня адбылося першае пасяджэньне ўрадавай камісіі, на якім прыняты пастановы аб разьмеркаваньні і парадку работы.

У работу камісіі, акрамя членаў яе, уцягнуты і мясцовыя працаўнікі.

Арганізаваны наступныя камісіі і падкамісіі: па пастаноўцы плянавай статыстычнай работы і работы прэзыдыуму АВК; адзінай бухгальтэрыі, канцылярыі, гаспадарчага абслугоўваньня, па рэарганізацыі гаспадарчых аддзелаў, па пытаньнях рэарганізацыі, вялмельнай справы, па пытаньнях сацыяльна-культурнага абслугоўваньня (парасьветы, аховы здароўя, працы, сабес); судова-адміністрацыйных.

Акрамя таго спэцыяльна вылучаная падкамісія займецца распрацоўкай бюджэтных цытаньняў, таксама вылучана камісія пад кіраўніцтвам старшыні АВК тав. **Валодзька** па разьмеркаваньні прамысловых прадпрыемстваў паміж акругай, гарадамі і раёнамі.

Група пад кіраўніцтвам т. Мундау будзе прапрацоўваць пытаньне аб сетцы раённых сельсаветаў.

Асобная група працаўнікоў будзе прапрацоўваць пытаньні функцый і штату гарсавету.

За сакратара ўрадавай камісіі прызначаны тав. Яцкоў — старэйшы інспэктар НК РСІ БССР.

Праведзена нарада кіраўнікоў усіх груп і падкамісій, дзе апошнія атрымалі належныя інструкцыі.

27-га ліпеня адбудзецца нарада старшынь райвыканкомаў і сакратароў РК КП(б)Б, на якой будуць абгаварвацца пытаньні рэарганізацыі акругі.

25-га ліпеня зьбіраецца гарадзкі партактыў Віцебску, на якім стаіць даклад аб арганізацыі вопытна-паказальнай акругі.

Г—ч.

3-я пазыка індустрыялізацыі—

забясьпечвае выкананьне 5-ці годкі

Месячны заработак у доўгатэрміновую пазыку дзяржаве на індустрыялізацыю краіны

Уцягнуць у рэалізацыю пазыкі ўвесь актыў гораду і вёскі

ПАЗЫКА САЦЫЯЛІСТЫЧНАЙ РЭКАНСТРУКЦЫІ

Шматлікія групы рабочых і сялян зьвярнуліся да савецкага ўраду з настойлівым патрабаваньнем выпусьціць трэцюю пазыку індустрыялізацыі. **Апублікаваная пастанова ўраду аб выпуску 750 мільёнае пазыкі індустрыялізацыі народнай гаспадаркі СССР ідзе галоўным чынам на сустрэч пажаданьням самых шырокіх мас рабочае клясы і працоўнага сялянства.**

Мы стаім на парозе другога году пяцігодкі вялікае работы. На вялізным абшары пралетарскай дзяржавы ва ўсіх кутках савецкай краіны ідзе напружаная перабудова ўсяе гаспадаркі і быту на новых сацыялістычных падставах.

Адкуль чарпае рабочая кляса сродкі для гэтай гіганцкай работы? Дзе крыніцы сотняў мільёнаў, патрэбных для пабудовы заводаў-волатаў, электрацэнтралаў, новых чыгуначных ліній? Звычайныя прыбыткі дзяржавы—падаткі і акцызы, унутраныя накапленьні прамысловасьці і г. д. ня змогуць поўнасьцю задаволіць усе патрэбы капітальнага будаўніцтва. Замежныя капіталісты не даюць нам пазык.

Але за тое ў нас ёсьць такія крыніцы фінансаваньня народнае гаспадаркі, якіх няма ў краіне капіталізму, у нас ёсьць **унутраныя рабоча-сялянскія пазыкі, заснаваныя на глыбокім падтрыманьні справы сацыялістычнай індустрыі шырокімі масамі працоўных нашай краіны.**

Трэцяя пазыка індустрыялізацыі выпушчана на 750.000.000 руб. Гэта вялікая сума, аднак, яна можа і павінна быць разьмеркавана поўнасьцю. Другая пазыка індустрыялізацыі, якая была выпушчана на 500 мільёнаў руб., разышлася ў самы кароткі час, раней, нават, вызначанага ўрадам, тэрміну. Між тым нават у горадзе каля 20 проц. арганізаваных рабочых і служачых зусім не ахоплены ніякімі пазыкамі. На вёсцы сярэдняя сума падпіскі на душу насельніцтва складае ўсяго толькі 2,2 руб.

Такім чынам, пры ўмовах энэргічнага распаўсюджваньня пазыкі ў горадзе і ў вёсцы, сума ў 750.000.000 руб., на якую выпушчана трэцяя пазыка індустрыялізацыі, зможа быць рэалізавана без асаблівых труднасьцяй у кароткі тэрмін.

Вялікую ролю ў пасьпяховым распаўсюджваньні пазыкі адыгрывае шырока і добра наладжаная растлумачальная работа. Растлумачэньне мэт і характару пазыкі, а таксама ўмоў падпіскі, карысьці, якую дае пазыка як трымальнікам, так і дзяржаве, зьяўляецца важнейшай задачай гэтай кампаніі. Для гэтай работы трэба мабілізаваць усю рабоча-сялянскую грамадзкасьць. Камісіі садзейнічаньня дзяржкрэдыту пры ўсіх прадпрыемствах, установах, каапэратывах, калгасах, саўгасах, пры ўсіх сельсаветах і г. д. павінны стаць **сапраўднымі штабамі**, якія-б мабілізавалі ўсе сілы мясцовага актыву для прапаганды пазыкі.

Асабліва адказная роля ў прапагандзе і распаўсюджваньні пазыкі належыць вясковай інтэлігенцыі — настаўніцтву, аграномам, дактарам, паштовым працаўнікам і г. д.—яны ў першую чаргу павінны дапамагчы распаўсюджваньню сярод сялянства аблігацый дзяржаўных пазык.

Р—ч.

Рабочы майстэрняў т. Ліўшыц падпісаўся на 200 проц. месячнай зарплаты.

Работніца дапаможных майстэрняў БДВ т. Бірбаўм, атрымліваючы 38 руб. у месяц, падпісалася на 100 руб.

Рэалізавана больш 250 тысяч рублёў

ГОМЕЛЬ. (Наш кар.). У Гомелі на 24-га мая папярэдняя падпіска на трэцюю пазыку перавысіла 250 тысяч рублёў. Трэба адзначыць, што падпіска праводзіцца бяз удзелу нізавых прафячэек і камісій садзейнічаньня дзяржкрэдыту.

Падпіска ў Мазыры

Мазыр (наш кар.). Папярэдняя падпіска на 3-ю пазыку ў гарадзкіх прадпрыемствах і ўстановах дала значныя вынікі. На сёньняшні дзень падпіска сабрана на суму да 60.000 руб.

Слаба рэалізуецца пазыка на мясцох. У некаторых раёнах значэньне пазыкі зусім не растлумачана.

Наш адказ Чан Кай-шы

Папярэдняя падпіска на 3-ю пазыку ў часьцях 33-й дывізіі прынала шырокія разьмеры. Так за адзін дзень падпіска дала больш 20.000 рублёў. Дзьве роты №-скага палку сабралі 1.600 р., рота сувязі—1.000 руб. і г. д. Падпіска ідзе пад лёзунгам: «Наш адказ Чан-Кай шы».

Акрамя таго, у палках разгарнулася спаборніцтва па захаваньні аблігацый пазыкі.

Начскład і чырвонаармейцы выявілі вялікую сьвядомасьць: шмат камандзіраў падпісалася на двухмесячную пэнсію.

Так адказвае начскład і чырвонаармейцы 33 дывізіі на бандыцкі налёт кітайскіх імпэрыялістых.

СЕНЬ.

Спэцыялістыя адлічваюць у пазыку 1 з пал. месячны заработак

Падпіска сярод служачых **Белмэталтрэсту** за адзін дзень дала 4.425 руб. пры заработку служачых, што падпісаліся ў 3.300 руб.

Інжынэр **Фіш** падпісаўся на 600 руб.—больш чым на 150 проц. месячнай зарплаты.

Тав. **Іванокі**, які атрымлівае 250 руб. падпісаўся на 400 руб.

Тав. **Трэйсьнер**, атрымлівае 243 руб. пэнсіі, а падпісаўся на 350 руб.

***

Сход ІТС фабрыкі **«Чырвоная Бярэзіна»** пастанавіў усім інжынэрна-тэхнічным працаўнікам фабрыкі падпісацца на месячны заработак. Пасьля сходу была праведзена падпіска, якая дала бліскучыя вынікі, усе члены ІТС падпісаліся на пазыку, многія—на 150—200 проц. зарплаты.

Сэзоньнікі падпісваюцца на пазыку

ВОРША. (Наш кар.). Пачалася рэалізацыя другой пазыкі індустрыялізацыі сярод сэзоньнікаў.

Вельмі добра і прыкладна прайшла падпіска на пазыку сярод сэзоньнікаў, якія працуюць на **пабудове мясного камбінату.** Усе рабочыя падпісаліся на пазыку ня менш, як на двухтыднёвы заработак, а некаторыя на значна большыя сумы. Такім чынам заданьне па распаўсюджваньні пазыкі сярод рабочых на пабудове мясного камбінату—выканана.

Гэтыя рабочыя даюць добры прыклад усім іншым сэзоньнікам Аршаншчыны.

Вялікі посьпех пазыкі на Бабруйшчыне

Шпаркім тэмпам ідзе ўперад падпіска на прадпрыемствах Бабруйшчыны.

Гута «Кастрычнік» дала ўжо 11 тысяч. Рабочы ПУЛЬЯНОЎСКІ, які зарабляе 120 руб., падпісаўся на 300 р., рабочыя ЗЭНДЭЛЬ І ГАЎРЫЛАЎ, атрымліваюць па 120 руб., а падпісаліся на 250 рублёў кожны.

На трох бабруйскіх пільнах падпіска ўжо дасягнула 21 тысячы. Рабочыя БЯДНОЎ, ТАРАСАЎ І ЗЭЙКА, зарабляючы па 75 р., падпісаліся на 250 р.

Калектыў аддзяленьня Белдзяржгандлю падпісаўся на 125 проц. месячнай пэнсіі.

Група ЖЛОБІНСКІХ грузчыкаў падпісалася на 1.200 р.

У ГЛУСКУ на мітынгу пратэсту супроць прапаганды кітайскіх налётчыкаў, 50 чал. падпісалася на месячны заработак.

На АЛЕЙНІ ІМЯ АДЗЕРЫХА падпіска толькі яшчэ пачалася, пакуль што сабрана 1.780 рублёў. Стары рабочы Марчанка, які атрымлівае 80 руб., падпісаўся на 200 руб.

Пачалася падпіска ў вайсковых часьцях гарнізону.

Ш.

Рэвалюцыя на палёх Клімаўшчыны

Арганізацыя калгасу „Ленінскі шлях" дала магутны штуршок справе калектывізацыі.—У Клімаўшчыне арганізаваны яшчэ 3 новыя вялікія калгасы.—75 проц. двароў Пуцімльскага сельсавету--калектывізавана.--„Калектыўна можна і горы варочаць"--заяўляюць калгасьнікі

(Ад нашага клімавіцкага карэспандэнта)

Ня так даўно мы паведамлялі нашым чытачом аб арганізацыі найвялікшага калгасу «Ленінскі шлях» у Клімаўшчыне. Гэты прыклад даў вялікі штуршок справе калектывізацыі ў раёне. «Ленінскі шлях» пачалі наведваць шматлікія дэлегацыі ваколічнага сялянства. Весткі аб гэтым калгасе пашыраліся ня толькі ў межах Клімаўшчыны а і ў суседніх —Крычаўскім, Касьцюковіцкім, Хоцімскім і інш. раёнах Магілеўшчыны. Асабліва наведвалі «Ленінскі шлях» сяляне вёскі Савінічы, якая знаходзіцца на адлегласьці 13 кілёмэтраў ад калгасу. Наведаўшы «Ленінскі шлях», сялянства ўпэўнілася, што калгасьнікі, асабліва былая беднота ад калектывізацыі нічога ня страціла, апрача сваіх лапцей. Наведвальнікам адразу кідаліся ў вочы добрыя пасевы калгасу: авёс, ячмень і інш. культуры «вышэй поясу» і розьніца па сваёй якасьці ад пасеваў нават бліжэйшых кулацкіх гаспадарак. Калгасьнікі «Лапінскага шляху» з свайго боку парашылі накіраваць у вёску дэлегатаў, якія на месцы расказалі савінічанам аб сваім жыцьці.

Нарэшце і ў Савінічах арганізаваўся вялікі калгас з 80 двароў, на плошчы 1.000 гэктараў.

Добры прыклад быў перанесены і ў Пуцімльскі сельсавет, які знаходзіцца на другім канцы раёну. У гэтым сельсавеце распачалася ўпартая падрыхтоўчая праца па калектывізацыі ўсяго сельсавету. **Спачатку ўтварыўся калгас з 50 двароў у вёсцы Нядзьведзь.** Але частка сялянства ў пачатку ня зусім даверліва аднеслася да таго, што магчыма зараз-жа правесьці земляўпарадкаваньне, што сапраўды існуюць вялікія калгасы, што мажліва наогул існаваньне гэтых вялікіх калгасаў. Некаторыя сяляне ня верылі, што ў «Ленінскім шляху» дружна жывуць калгасьнікі, бо кулакі гаварылі, што нібыта там б'юцца, — пускаюць у ход нажы. І каб упэўніцца ў тым, як сапраўды жывуць калгасьнікі, сяляне накіравалі ў «Ленінскі шлях» сваіх прадстаўнікоў.

Сяляне хутка ўпэўніліся, што і земляўпарадкаваньне зараз-жа мажліва, бо прыехалі каморнікі і прыступілі да справы. Зьявіліся прадстаўнікі з раёну і паставілі пытаньне аб утваральні больш буйнага калгасу, і ў выніку 19 ліпеня, **уся вёска Нядзьведзь цалкам** (за выключэньнем заможнікаў і няпрыняятых у калгас) — **у ліку 140 двароў уступіла ў калгас.**

На першым арганізацыйным сходзе калгасьнікі пастанавілі назваць свой новы буйны калгас — «Бальшавік», абралі ганаровымі членамі калгасу — бюро ЦК КП(б)Б і ўдзельнікаў у арганізацыі яго сакратара райкому партыі тав. Соскіна і старшыню РВК — тав. Тарасенка. Як раз да моманту арганізацыйнага афармленьня калгасу каморнікі шляхам **спаборніцтва адбілі мяжу плошчы палёў калгасу ў 1.500 гэктараў.** 20 ліпеня раніцай брыгады новага калгасу «Бальшавік» **з чырвонымі сьцягамі пасьля мітынгу выехалі ў поле араць пад азіміну.**

Калі доўгая стужка сотняў фурманак ў кароткі час вывезла на поле і раскінула ўгнаеньне, учарашнія малаверы сёньня ўжо гаварылі аб тым, што «сапраўды калектыўна магчыма і горы варочаць»... «Вось, кажа адзін з іх,—гэта сапраўдная рэвалюцыя сельскае гаспадаркі».

Нежадаўшыя раней уступіць у калгас зараз просяць з сьлязьмі на вачох аб прыняцьці, а некаторыя вывозяць гной з сваіх двароў, «самастойна» далучаюцца да брыгад і разам з калгасьнікамі едуць на калгаснае поле.

***

У Пуцімльскім сельсавеце — апрача калгасу «Бальшавік» у часе яго афармленьня таксама, узбуйнены і афармлены новы калгас у в. «Пажар», пад назваю «Расьсьвет», **у які ўвайшло выключна ўсё сялянства гэтай вёскі. Плошча гэтага калгасу складае 500 гэктараў.** З 21-га ліпеня калгасьнікі пастанавілі выехаць для ворыва пад азіміну.

На сёньняшні дзень, Пуцімльскі сельсавет калектывізаваны па папярэднім пад ліку на 70-75 проц.

***

Арганізацыя новых буйных калгасаў у Клімаўшчыне і праробленая праца па калектывізацыі цэлага Пуцімльскага сельсавету — ёсьць толькі першы крок уперад да ажыцьцяўленьня пастановы 16-й партканфэрэнцыі. Трэба спадзявацца, што вялікі калгас «Бальшавік» па прыкладу калгасу «Ленінскі шлях» апраўдае сваю назву, пабальшавіцку замацуе свае рады і эканамічнае становішча.

АСМАЛОЎСКІ.

ЧЫРВОНАЯ АРМІЯ

Скончыўся лягерны збор студэнтаў БДУ

«Кожны студэнт павінен аўладаць ня толькі навуковымі ведамі, але і чырвонаармейскай вінтоўкай». Такую задачу паставіла перад сабою наша студэнцтва, і гэтую задачу яно энэргічна выраша.

Сёньня вярочаюцца ў горад пасьля шасьцітыдневага побыту ў вайсковых лягерах студэнты БДУ. Ім трэба было зрабіць нялёгкую працу — у працяту гэтага кароткага тэрміну стаць зусім падрыхтаванымі байцамі — абаронцамі нашае сацыялістычнае бацькаўшчыны. І ўсё-ж свае абавязкі студэнты з гонарам выканалі: вайсковае камандваньне расцэньвае вынікі па тактычна-стралковай, хэмічнай вучобе студэнтаў-чырвонаармейцаў як зусім здавальняючыя. Што-ж датычыць страявой выпраўкі, сьпеваў, то студэнцкія часьці ў лягерах проста такі ставіліся ў прыклад старасьлужачым чырвонаармейцам.

Студэнты — будучыя камандзіры запасу, аднесьліся да сваіх вайсковых абавязкаў ва ўсіх адносінах сьвядома. Дысцыпліна была вусім на вышыні, колькасьць спагнаньняў параўнальна вельмі невялікая: агульны іх лік за ўвесь час не дасягаў і дзесятку. І гэта тлумачыцца зусім не паблажлівымі адносінамі камандваньня да студэнтаў-чырвонаармейцаў: у студэнцкіх часьцях падтрымлівалася тая-ж моцная дысцыпліна, якая наогул існуе ў нашай Чырвонай арміі. Тут галоўную ролю адыгралі іменна добрасумленныя адносіны саміх студэнтаў да ўсіх загадаў камандваньня. Таварыскасьць паміж камскладам і студэнтамі-чырвонаармейцамі была найлепшая, але студэнты заўсёды ўмелі адрозьніваць, дзе канчаецца таварыш і пачынаецца камандзір.

Скаргаў на цяжкасьць вайсковай службы ня было. Адзінкавыя выпадкі нецьцьцьці — моў, занадта ўжо суровая дысцыпліна, што нагляделіся ў першыя дні, самі студэнты адразу-ж дружна прасеклі, ахрысьціўшы нецьцьцьц

МЕНСК

На пленуме Менгарсавету

Не забываць аб ваеннай небясьпецы

Менскі гарадзкі савет, заняты пытаньнямі гаспадарчага і культурнага будаўніцтва і дабрабыту гораду, даўно ўжо не заслухваў дакладаў аб міжнародным становішчы.

— Працоўныя, захапіўшыся будаўніцтвам новага жыцьця, неяк адсталі ад пытаньняў міжнароднай палітыкі, між тым жыцьцё патрабуе пільнай увагі да міжнародных падзей,—адзначыў у сваім дакладзе аб міжнародным становішчы СССР на пленуме Менскага гарадзкога савету заг. АПА акругкому **тав. Цэнцыпер,**—ня месца і ня час цяпер для бясьпечнасьці і спакойнага нацыфізму. Ігіанцкімі крокамі набліжаецца новая вайна.

Тав. Цэнцыпер падрабязна ахарактарызуўшы нарастаньне супярэчнасьцяй паміж капіталістычнымі дзяржавамі, паміж імпэрыялістымі і СССР, што няўхільна вядзе да імпэрыялістычнай бойні.

— 10 мільёнаў забітых, 60 мільёнаў параненых, сотні мільярдаў згубленага нацыянальнага багацьця, што накаплялася вякамі—такі баланс вайны 1914-18 году. Новая вайна будзе яшчэ больш жудаснай, яшчэ больш лютай, чым мінулая. Тав. Цэнцыпер малюе рост узбраеньняў капіталістых, шалёную гонку дзяржаў у будаўніцтве марскога і паветранага флёту, у выпрацоўцы атрутных газаў.

— Працоўныя СССР павінны рыхтавацца да новай вайны, акружыць любоўю і клопатамі Чырвоную армію, памятаць, што посьпехі сацыялістычнага будаўніцтва — парука абароназдольнасьці Савецкага Саюзу.

У сваёй пастанове па дакладу пленум гарадзкога савету **ўхваліў мірную палітыку Савецкага Саюзу.**

— Падзеі на К.-Усх. чыг. паказваюць, што імпэрыялістыя імкнуцца справакаваць вайну. Ужываючы ўсе меры да захаваньня міру, савецкі ўрад павінен моцна ўдарыць налётчыкаў па руках. **Пленум заклікаў усіх працоўных гораду ў адказ на правакацыю—разгарнуць сацыялістычнае спаборніцтва і пагалоўна падпісацца на 3-ю пазыку.**

У дзень 1-га жніўня ўсе працоўныя гораду павінны прыняць актыўны ўдзел у пратэсьце супроць падрыхтоўкі новай вайны.

На прапанове дэлегатаў заводу «Камунар», пленум абавязаў усіх членаў і кандыдатаў гарсавету падпісацца на 3-ю пазыку ў разьмеры ня менш месячнага заработку.

Вынікі навучальнага году

Пленум гарсавету заслухаў даклад інспэктара народнай асьветы **тав. Ермакова** аб выніках навучальнага году ў Менскіх школах.

Дакладчык кажа, што школа за апошні год дасягнула значных посьпехаў. Яна стала лепш выконваць ролю **савецкай працоўнай школы,** яна больш наблізілася да жыцьця, яна непасрэдна занялася выхаваньнем новага грамадзяніна. Аб тым, што школа наблізілася да жыцьця, гаворыць рад фактаў. Школьнікі падпісаліся на 3 тысячы рублёў на 2 пазыку, яны сабралі 5 тон попелу, 25 тон лому, 1½ тоны папяровай макулятуры, прынялі актыўны ўдзел у выбарах у саветы—разносілі позвы, заклікалі бацькоў зьявіцца на выбары; у часе каляд і вялікадня толькі 2 проц. вучняў не наведалі школы, замест 20 проц. у мінулым годзе.

Палепшылася інтэрнацыянальнае выхаваньне вучняў, антырэлігійная прапаганда прасякла ў зьмест выкладаньня ў школах. Лік двугодзікаў зьменшыўся за год на 2 проц. У гэтым годзе бяднейшым вучням выдана дапамога ў 12 тысяч руб., замест 3.000 у мінулым годзе.

Але яшчэ ня зьнішчана адрыжка старой буржуазнай школы.

Аб рэштках мінулага гаварыў сам дакладчык і члены гарсавету, выступаўшыя ў спрэчках.

— Паасобныя настаўнікі **змазваюць клясавую лінію ў школе** як у выкладаньні, так і пры прыёме. У некаторых школах вынесены пастановы, што ўсе вучні павінны плаціць адналькавую плату.

— Выяўлены рад **выпадкаў антысэмітызму** і, наогул, нацыянальнай варожасьці, якая часта падтрымліваецца настаўнікамі.

— Наглядаецца «очковтирательство» — настаўнікі замазваюць недахопы школьнай работы.

— У аднэй з школ нават адбылася дуэль паміж вучнямі з традыцыйнымі сэкундантамі.

— Яшчэ **вялікі адсеў у школах**—да 10 проц. Многія дзеці рабочых і беднякоў кідаюць школы з-за матар'яльных і сямейных прычын.

— **Страшэнна цесна ў школах.** У кожным школьным будынку працуюць 3-4 зьмены. У выніку пакоі дрэнна праветрываюцца. На аднаго школьніка прыходзіцца толькі каля паловы мінімальнай школьнай плошчы. **Трэба рашуча паставіць пытаньне аб пабудове новых памяшканьняў для школ.**

— І нарэшце, інспэктура асьветы «наскокам» абсьледавала толькі 40 проц. школ г. Менску. **Б—ў.**

У прэзыдыуме гарсавету

Справаздачныя сходы гарсавету

У першай палове кастрычніка гарсавет пачынае справаздачную кампанію перад выбаршчыкамі. На ўсіх прадпрыемствах і па ўстановах адбудуцца сходы выбаршчыкаў, на якіх будуць заслуханы даклады гарсавету аб рабоце за 6 месяцаў.

Культурны гарадок на Барысаўскім тракце

Прэзыдыум гарсавету вынес пастанову аб тым, каб усе новыя культурныя ўстановы, якія мяркуецца адкрыць у Менску, былі пабудаваны ў раёне Барысаўскага тракту.

500 руб. на піянэрскі зьлёт

Прэзыдыум гарсавету адпусьціў 500р. акруговаму бюро юных піянэраў на арганізацыйныя выдаткі па піянэрзьлёце.

Сынагогу пад клюб

Сынагога па Ракаўскай вул., № 20, па патрабаваньні рабочых раду прадпрыемстваў перадана для культасьветнай работы рабочкому хлебазаводу.

У прэзыдыуме ЦВК БССР

Дапамога пагарэльцам мяст. Чачэрску

Прэзыдыум ЦВК БССР заслухаў даклад старшыні Чачэрскага РВК т. Вінаградава і старшыні праўленьня Белдзяржстраху т. Чарнушэвіча, які спэцыяльна выяжджаў у Чачэрск па даручэньні прэзыдыуму ЦВК БССР.

Выплачана ўсяго страхавой узнагароды прыватным уласьнікам звыш 37 тыс. р. Зараз-жа пасьля пажару была арганізавана грамадзкая кухня для харчаваньня бяднейшых пагарэльцаў. Пагарэльцы разьмешчаны ў школах, інтэрнаце і прыватных кватэрах. Сабрана ў парадку ўзаемадапамогі і раздана бяднейшым пагарэльцам каля 3 тысяч руб. Прынятыя тэрміновыя меры да зем-паўпараджаваньня мястачка, частка аўрэйскай беднаты перасяляецца ў аўрэйскія калгасы.

Прэзыдыум ЦВК намеціў рад мерапрыемстваў, каб палепшыць становішча пагарэльцаў, у прыватнасьці, СНК даручана абгаварыць пытаньне аб гаспадарчым упарадкаваньні мястэчка з гэтага году

Арганізаваны пасялковы савет дзяржаўнай электрастанцыі імя Сталіна

Прэзыдыум ЦВК вызначыў межы пасялковага савету першай дзяржаўнай электрастанцыі імя Сталіна. У склад савету ўваходзяць паселішчы: вёска Арэхі, пасёлкі—Сталінбуд і Выдрыца,—хутары—Брухава Новае, Брухава Старае і засьценак Машчаны. Цэнтрам пасялковага савету ўстаноўлен пасёлак Выдрыца.

Артэнскаму АВК даручана надаць пасялковаму савету самастойны бюджэт з 1929-30 г. Разам з тым прэзыдыум ЦВК зацьвердзіў цыркуляр на імя пасялковага савету, у якім паказаны асаблівасьці работы савету.

Сакратарыяты пры акрвыканкомах

Прэзыдыум ЦВК згадзіўся з думкай акрвыканкомаў аб арганізацыі сакратарыятаў акрвыканкомаў для вырашэньня дробных пытаньняў, а таксама для падрыхтоўкі пытаньняў да пасяджэньняў прэзыдыумаў АВК.

Менск будуецца

У унівэрсытэцкім гарадку

Будаўніцтва унівэрсытэцкага гарадка ідзе шпаркім тэмпам. У анатамічных, мэдыцынскіх і прыродазнаўчых карпусох зараз тынкуюцца сьцены, шклянца ваконныя пераплёты, насьцілаецца паркетная падлога, прыступлена да афарбаваньня сьцен. Ідзе таксама тынкаваньне сьцен хэмічнага корпусу,

У галоўным корпусе робіцца выкладка апошняга паверху, а ў актавай залі бэтануюцца кэсонавыя перакрыцьці.

Ёсьць цьвёрдая ўпэўненасьць, што 4 карпусы будуць адкрыты 1-га лістапада бягучага году. Прыступлена да пляніроўкі ўнутранага унівэрсытэцкага двара. Галоўны аўдыторны корпус у бягучым годзе будзе пакрыты дахам, пабудова яго будзе поўнасьцю скончана ў жніўні 1930 году.

На пабудове унівэрсытэцкага гарадка штодзенна працуе да 800 рабочых.

На пабудове клінічнага гарадка

На пабудове клінічнага гарадка па Барысаўскім тракце занята штодзенна 300 рабочых. Зараз ідзе кладка сьцен першых двух карпусоў. У трэцім корпусе ўжо гатовы цокальны паверх. Да пабудовы 4-га корпусу будзе прыступлена 1-га жніўня. У першым корпусе будзе разьмешчана тэрапэўтычная клініка, у 2-м — хірургічная, у 3-м — гінекалёгічная і ў 4-м корпусе—клініка па наскурна-вэнэрычных хваробах. У кожным корпусе будзе арганізавана аўдыторыя на 150 студэнтаў, рэнгенаўскі габінэт, апрацыйныя залі, ізалятары. Першыя паверхі карпусоў будуць заняты навучальна-лябараторнымі памяшканьнямі. 2-гі паверх будзе заняты палатамі для хворых з адкрытымі бальконамі і спэцыяльнымі дахамі для лячэньня сьвятлом (салярыямі).

Да клінік гораду, згодна пастановы гарсавету, будзе праведзена лінія трамваю. Пабудова першых 4-х карпусоў будзе скончана да 1-га лістапада 1930г. і абыйдзецца ў 1.500.000 р.

Новы будынак дзяржаўнай бібліятэкі

Пачалася пабудова Беларускай дзяржаўнай бібліятэкі па праекце, які склаў архітэктар Лаўроў разам з Жаўткевічам.

Зараз плошча пабудовы ачышчана ад дамоў і прыступлена да разьбіўкі будынку. У бягучым годзе, згодна дагавору, будуць выведзены толькі цокольны і першы паверхі будынку. Па пляну пабудова будзе скончана ў лістападзе 1930 году.

Да прыёму ў ВНУ

140 калгасьнікаў у ВНУ

Наркамасьветы прапанаваў забраніраваць за калгасьнікамі 1 іх дзяцьмі 25 месц на факультэце калектыўнай гаспадаркі с.-г. акадэміі і 25 месц у новым тэхнікуме калектыўнай гаспадаркі. Акрамя гэтага за калгасьнікамі бронируецца 15 месц у Марчна-Горскім с.-г. тэхнікуме, 10 месц—ў Стара-Барысаўскім і 70 месц па іншых факультэтах с.-г. акадэміі.

Ільготы паступаючым у ВНУ

Наркамасьветы даў дырэктывы прыймовым камісіям, каб усе асобы, якія вытрымалі іспыты ў мінулым годзе, пры паступленьні ў бягучым годзе ад іспытаў былі аслабанены.

336 заяў у БДУ

На 25 ліпеня ў БДУ падана толькі 336 заяў, з якіх на мэдфак--103, на пэдфак --141, хэмфакультэт--66 і праўфас--26. У Менскі політэхнікум падана 529 заяў, з якіх 183 заявы паданы рабочымі.

Інтэрнаты для студэнцтва

Прэзыдыум Менскага гарсавету вылучыў камісію пад старшынствам т. Крузмата для праверкі, ці правільна скарыстоўваюцца памяшканьні ўстаноў Наркамасьветы. Уся лішняя жыльлёвая плошча будзе перадана пад інтэрнаты для студэнцтва.

ЗА ДЗЕНЬ

Прыём рабочых у швейную фабрыку. На фабрыцы Меншэвэю прынята 109 новых рабочых, якія пакуль яшчэ працуюць у старым памяшканьні фабрыкі Канчаткоўны пераход фабрыкі ў новае памяшканьне—у жніўні месяцы.

Экскурсіі працаўнікоў асьветы. Саюз працасьветы правёў рад экскурсій на Днепрабуд, у Маскву, Ленінград і Каўказ. У экскурсіях прымала ўдзел звыш 100 працаўнікоў асьветных установ Менску.

СУД

Да справы антысэміта Цярэшкі

Вярхоўны суд зацьвердзіў прыгавар над настаўнікам-антысэмітам Цярэшка, які быў прыгавораны Вабруйскім акруговым судом да 2-х год пазбаўленьня волі з суровай ізаляцыяй. Па амністыі тэрмін зьняволеньня яму скарочаны на палавіну.

Спорт

28 ліпеня пачынаецца 2-хтыднёвік фізкультуры

28-га ліпеня пачынаецца 2-х тыднёвік фізкультуры. А 9 гадзіне зранку наладжваецца сход усіх фізкультурнікаў. Увечары будуць праведзены сходы членаў гурткоў фізкультуры, прысьвечаныя 2-х тыднёвіку фізкультуры. У садзе «Прафінтэрн»—увечары гульні па ўсіх відах спорту.

Падрыхтоўка да взлёсыпэднага прабегу

Задьверджаны склад менскай каманды ва ўсебеларускім зорным взлёпрабезе. Каманда паедзе па маршруту Менск-Астрашыцкі Гарадок - Лагойск, Плешчаніцы-Зембін-Барысаў-Менск. Усяго менская каманда пакрые 350 кілёмэтраў. Каманда выяжджае ў панядзелак, а 6 гадзіне з плацоўкі салу «Прафінтэрн».

Спаборніцтва па стральбе ў доме Чырвонай арміі

З 27 ліпеня па 11 жніўня, дом Чырвонай арміі праводзіць конкурс па стральбе з малакалібэрнай вінтоўкі і рэвольвэра сыстэмы „Наган" сярод начскладу (у тым ліку і малодшага) часьцей Менскага гарнізону. У спаборніцтве па вінтоўцы могуць удзельнічаць усе члены ДЧА.

Для ўдзелу ў конкурсе не патрэбна папярэдняя запісь. Спаборніцтва праводзіцца ў цірі дому Чырвонай арміі ад 18 да 19 з палов. гадз., акрамя аўторкаў, і ў лягерах Зденовіч.

У Менску адкрываецца аддзяленьне цэнтравыдавецтва

Цэнтральнае выдавецтва народаў СССР пры ЦВК Саюзу адкрывае свае аддзяленьне ў Менску. Аддзяленьне ўсімедца друкаваньнем літаратуры на мовах нацменшасьцяў БССР, прыцягненьнем і вазьўленьнем новых аўтараў з нацменшасьцяў і г. д.

Выдавецкім плянам аддзяленьня намячаецца выпусьціць 618 друкаваных аркушаў на яўрэйскай мове, 236—на польскай, 56—на латыскай і 94—на літоўскай мове.

Цэнтральнае выдавецтва выдае зараз літаратуру на 52 мовах, у тым ліку 24 пэтыдычныя выданьні на 12 мовах.

У БССР--недахоп шофэраў

Няма працаўнікоў для абслугоўваньня новых аўтамашын

Трэба тэрмінова адкрыць прафшколу аўтатранспарту

Хуткі тэмп разьвіцьця аўтатранспарту ў Беларусі, асабліва, за апошні год і значны рост аўтаадзінак паводле пяцігадовага пляну высоўвае важнейшую праблему—забясьпечыць аўтатранспарт рабочай сілай. Ня вырашыўшы карэнным чынам праблемы падрыхтоўкі аўтапрацаўнікоў, мы ня зможам выканаць намечанага пяцігадовага пляну завозу аўтамашын. У Беларусі ў даны момант няма ніводнага беспрацоўнага шофэра. За апошні год паступілі на работу нават такія шофэры, якія на працягу некалькіх год працавалі на другіх работах і не маюць належнай кваліфікацыі. З праверанных камісіяй Белдартрансу 307 шофэраў па Беларусі толькі 11 проц. вытрымала іспыты па 1-й катэгорыі, 37 проц. — па другой і 37 проц. — па III-й катэгорыі. Гэта гаворыць за тое, што **ў большасьці сваёй шофэры маюць нізкую падрыхтоўку.**

Увесь цяперашні кадр шофэраў атрымаў кваліфікацыю ў пэрыяд вайны, спэцыяльных школ навучаньня не праходзіў, многія з шофэраў малапісьменныя і нават няпісьменныя.

Пры такім становішчы з рабочай сілай даволі цяжка ўзьнімаць аўтагаспадарку. Дзякуючы малой падрыхтоўцы і нявопытнасьці шофэраў часта бываюць выпадкі нявытворчага прастою машын, частыя выпадкі псаваньня і паломкі машын.

Пяцігадовы плян Белдортранса прадугледжвае завоз у Беларусь 2.000 аўтадзінак, за 1929-30 г. павінна быць завезена 276 аўтамашын. Многія гаспадарчыя арганізацыі вырабілі заказы на машыны. Між тым у Беларусі няма ніводнага шофэра.

Мы зможам у пэўны дзень апынуцца ў такім становішчы, калі прыбудуць машыны, будуць патрачаны сродкі, а скарыстаць іх свачасова мы ня зможам з-за адсутнасьці шофэраў. Рыхтаваць шофэра тады, калі прыбудуць машыны, будзе позна, трэба аб гэтым паклапаціцца зараз-жа.

Ня раз, пачынаючы з лютага 1927 году, Белдортранс і ЦП саюзу транспартнікаў ставілі пытаньне ў Дзяржпляне, Наркамасьветы аб падрыхтоўцы рабочай сілы. Але ўсе хадайніцтвы не далі ніякіх вынікаў.

Разьвіцьцё аўтатранспарту патрабуе ў першую чаргу вырашыць пытаньне аб падрыхтоўцы рабочай сілы. **Белдортранс і Аўтадор павінны дабіцца адкрыцьця не пазьней гэтага году прафтэхнічнай школы аўта-працаўнікоў у Беларусі з тым, каб у канцы пяцігодзі выпусьціць мінімум 300 кваліфікаваных шофэраў і аўтамэханікаў.** Першы выпуск гэтай школы можа быць не раней, як праз два-тры гады, а ў працягу гэтых двух-трох год будзе завезена ў Беларусь звыш 500 аўта-адзінак. Патрэбную колькасьць рабочай сілы на першы час прыдзецца падрыхтаваць шляхам арганізацыі кароткатэрміновых курсаў.

КАСЬЦЕВІЧ.

На дапамогу піянэрскаму зьлёту

Для аказаньня дапамогі піянэрскаму зьлёту, г. зн. дэлегацыі прыехаўшых з розных куткоў Беларусі, бяру аднаго дэлегата для начлегу, і выклікаю пасьлеваць майму прыкладу наступных таварышоў: **сакратара партыйнай ячэйкі НКУС і спраўдому т. Губскага, Баранава і Плешакова.**

Камсамолец Дзікарштэйн.

Навіны навукі і тэхнікі

Новы будаўнічы матар'ял

У Новым Арлеане (ПАЗШ) пабудован новы завод для вырабу будаўнічага матар'ялу з рачнога і вазёрнага пяску па патэнту аднаго амэрыканскага хэміка. Новы будаўнічы матар'ял прадстаўляе сабою простакутныя пліты, падобныя да мармуровых. Яны вельмі моцныя, добра ўтрымліваюць цяпляню, не прапускаюць вільгаці. Ім можна надаваць пажаданую форму, колер і паверхню, пачынаючы ад бліскучай «глязураванай» і канчаючы буйна-зярністай. Новы будаўнічы матар'ял выробляецца без ўжываньня высокай тэмпэратуры або моцных ціскаў. Пясок сплаўляецца ў аднастайную масу пры дапамозе нескладаных хэмічных прапэсаў. Таму, новы будаўнічы матар'ял параўнаўчы танны.

Новы «сусьветны патоп»

У апошнія гады вучоныя запрапанавалі новыя тлумачэньні «сусьветнаму» патопу, што быў у дагістарычныя часы, і адлюстраваўся ў шматлікіх паданьнях усіх народаў. Вучоныя лічаць, што патоп гэты быў у канцы апошняга ледніковага пэрыяду, прыблізна гадоў 20.000 таму назад, у выніку бурнага раставаньня лёдавае «шапкі» паўночнага полюсу.

Абапіраючыся на гэтую тэорыю, аўстралійскі вучоны Эдворт Дэвід выступіў з сэнсацыйным прараканьнем, што зямлі пагражае новы... сусьветны патоп ад раставаньня паўдзённа-палярнага лёдавага насьцілу, які быццам-бы, павольна, але няўхільна зьмяншаецца. Між іншым усяго лёду паўдзённага полюсу хопіць толькі на тое, каб падняць узровень акіяну на 15 мэтраў. Аднак, і гэтага невялікага павышэньня вады досыць, каб заліць вялікую аблегласьць зямлі. Праверка тэорыі Дэвіда даручана, у ліку іншых задач, паўдзённа-палярнай экспэдыцыі Бэрда.

Паведамленьні

Кастрычнікавы райком КП(б)Б паведамляе, што ў суботу, 27-га ліпеня г.г. а 3-й гадзіне дня павінны зьявіцца ў райком КП(б)Б усе сакратары парт'ячэек Кастрычнікавага раёну.

Райком КП(б)Б.

— Бюро калектыву КП(б)Б БДУ і Выканбюро прафсэкцыі БДУ паведамляюць, што члены і кандыдаты КП(б)Б сумесна з беспартыйным студэнцтвам і навуковымі працаўнікамі павінны сабрацца 28-VII-29г., а 4 гадз. у будынку пэдфаку для ўдзелу ў райпартсхоле, які склікаецца Кастрычнікавым райкомам КП(б)Б.

— Бюро яч. КП(б)Б праўгасу БДУ. У вязелю 28 ліпеня, а 3 з пал. гадз. у будынак пэдфаку збор на адкрыты сход Кастрычнікавай раённай партарганізацыі. Прысутнасьць членаў і кандыдатаў КП(б)Б абавязкова.

Запрашаецца беспартыйнае студэнцтва.

— Прафіном факультэту праўгасу БДУ запрашае ўсіх студэнтаў, якія знаходзяцца у Менску, прыняць удзел у агульна-раённым партыйным сходзе 28 ліпеня, які арганізуе Кастрычнікавы райком КП(б)Б сумесна з беспартыйнымі рабочымі.

Збор адбудзецца ў будынку пэдфаку (Земляробскі зав.). а 3 гадз. 30 м. дня.

— Дом Асьветы. Сёньня ў садзе—вечар фізкультуры: гуляньне. кіно. Пач. а 8 г. увеч. Уваход па саюзных і клюбных кніжках. У выпадку дрэннай пагоды пераносіцца ў Дом.

— Дом Асьветы. Сёньня а 3 гадз. 30м адбудзецца сход ячэйкі ЛКСМБ Працасьветы. Пасьля сходу—паездка ў вёску. Узяць яды на 1 суткі.

Адказны рэдактар ЯН. АСЬМОЎ

У суботу, 27-га ліпеня, у садзе «Прафінтэрн» адбудзецца мітынг-масаўка камсамольскай арганізацыі сумесна з рабочай моладзьдзю ўсіх прадпрыемстваў гораду Менску. Збор па прадпрыемствах а 5 гадзіне, у РК КСМ а 6-й гадз., пачатак мітынгу а 7 гадзіне ўвечары. Уваход па камсамольскіх і прафсаюзных білетах.

Пасьля мітынгу--масавае гуляньне.

АК ЛКСМБ.

БЕЛДЗЯРЖТЭАТР
Музыкальная камэдыя і кам. опэра пад маст. кіраўн. Л. Г. МІРАЕВА.
Субота, 27 ліпеня „СИЛЬВА" ў 3-х дзеях, Кальмана.
Білеты ў касе тэатру ад 12—2 і ад 5 г. ув. і ў раб. 4—6 гадз. увеч. касе з 12—2 і ад Пачатак а 9 г.

КІНО-ТЭАТР „Культура"
Мастацкі фільм ШУКАНЬНЕ ДОЛІ ПАІ
звыш ПРАГРАМЫ гастролі ўсходняга аксамбля, сусьветнага атрацыёну
Пачатак сэансу роўна а 7 г. 30 м. Каса—ад 6 г.
Вялікі мастацкі гістарычны фільм ПАЛАЦ І ЦЫТАДЭЛЯ гістарычная кіно-драма ў 10 частках. 2 сэансы: пач. 1-с. а 9 г. 15 м., 2—10 г. 45 м.
Кіно-сад ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА Савецкая, 71.
Мастацкі фільм з цыклю вядомае карціны „Чатыры Чорта" Трагэдыя акрабата драма з ныцьня цыркуў у 8-мі частках. Пачатак а 7 г. 30 м. Каса—ад 5 гадз. 30 м.
КІНО Інтэрнацыянал
Новы мастацкі фільм НЕСПАДЗЯВАНЫ ГЭРОЙ Пачатак а 7 г. 30 м. Каса—ад 6 г.
КІНО Пралетары
Звыш праграмы гастролі артыста Ленінградз. тэатраў Б. А. Валенцінава. У праграме сатыра, юмар, частушкі і інш.
КІНО СПАРТАК
На вкране сусьв. фільм „МАТЬ" М. ГОРКАГА др. у 7 част. Пачатак а 7 г. 30 м. Каса адчынена ад 6 г.

АДКРЫТА ЗУБА-ЛЯЧЭБНІЦА
Мен. Акр. К-ту Чырвонага Крыжу, Інтэрнацыянальная вул., д. № 6.
Лячэньне, плёмбаваньне зубоў, выдаленьне бяз болі, лячэньне хвароб поласьці роту.
УСТАЎКА ШТУЧНЫХ ЗУБОЎ на наўчуку і золаце.
Цэны агульнадаступныя. Парада дармова.
У пячэбніцы працуюць кваліфікаваныя зубныя дактары з вялікім практычным стажам.
Членам Чырвонага Крыжу—СКІДКА.
Прыём з 9 з пал. г. ран. да 8 з пал. гадз. увечары штодзенна

БУДЫНАК ЦЫРКУ Панядзелак, 29 ліпеня
ЖЫВЫ АРТЫСТЫЧНЫ ШАХМАТНЫ ТУРНІР
ЧЫТАЙЦЕ АФІШЫ.

ТАРГІ
28 ліпеня ў саўгасе «СЕРП», м. Сьмілавічы, адбудуцца ТАРГІ на ПРАДАЖУ ЎРАДЖАЮ САДОЎ, плошчаю 9 гэктараў.
Адміністрацыя.

АДКРЫТ ПРЫЁМ ПАДПІСКІ на ЖНІВЕНЬ і наступныя месяцы НА ГАЗЭТУ ЗЬВЯЗДА
орган ЦК і Мен. АК КП(б)Б.
УМОВЫ ПАДПІСКІ: на 1 м.--90к., на 3м.--2 р. 60к., на 6 м.--5 р., на 1 г.--9 р. 75 к.
«Зьвязда» дае сваім падпісчыкам дадаткамі на льготных умовах часопісі

БАЛЬШАВІК БЕЛАРУСІ	Рабоче-Крестьянский КОРРЕСПОНДЕНТ	ОГОНЕК
1 м.—20 к. (замест 35 к.)	1 м.—25 к. (замест 30 к.)	1 м.—25 к. (замест 40 к.)

ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА:
У Менску: Гал. к-рай газ. «Зьвязда», Савецкая, 63, ня упоўнаважанымі, адда. «Известия» и «Правда», Беларускім газэтным бюро і газэтаносцамі.
Па акругах: Упоўнаважанымі газэты „Зьвязда", адда. „Известия" і „Правда", кіёскамі к-ва Друку і Усімі паштова-тэлеграфнымі канторамі.
З мэтай эканоміі газэтнай паперы, камплекты газэты „Зьвязда" будуць друкавацца за першыя чысла кожнага месяцу ў самай абмежаванай колькасьці.
Таму гал. кантора газ. „Зьвязда" просіць усіх падпісчыкаў здаваць падпіску да 28-га чысла. Па заказах, якія паступяць у гал. кантору несвачасова, к-ра не гарантуе высылкі газэты камплектам за першыя чысла, а толькі са дня паступленьня заказу.
Каб забясьпечыць атрыманьне першых нумароў «Зьвязды» за жнівень, просьба падпісацца загадзя, не пазьней 27—29 ліпеня.

СКОРА! ДА ЗАЎТРА СКОРА!
ПРАДАЮЦЦА БОЧКІ з жалезнымі абручамі ад друкарскай фарбы.
Зварочвацца да заг. гаспад. друк. «Зьвязды» (Савецкая, 63) ад 3—5 гадз. дня.

Абвешч. несапраўдн. вайсковая кніжка на імя Арабіна М. С.—знойдзена. Лічыць сапраўднай.

ЮЖХИМТРЕСТ
ЛУЧШИЙ СОВЕТСКИЙ КАРАНДАШ
ГЕНЕРАЛЬНЫЙ ПРЕДСТАВИТЕЛЬ ХИМСИНДИКАТ

История ЧЕЛОВЕЧЕСТВА
проф. Г. ВАН ЛУН.
Капитальн. труд знаменит. ученого, разошедш. в Америке в количестве 1.000.000 экз. 500 стр., многочисл. рис. Цена 2 т. —4 р., в роскошном переплете —5 р. 50 к.
Москва, Политехн. музей, 110-26.
Кооп. т-во «Культура и Знание»

АД МЕНСКАЙ П.-Т. КАНТОРЫ
У сувязі і тым, што на пошту здаюцца карэспандэнцыі на невялічкіх ласкутках папяровай паперы без канвэртаў, што затрымлівае апрацоўку карэспандэнцыі, Менская п.-т. к-ра папераджае кліентуру, што такія карэспандэнцыі адсылацца па прызначэньні ня будуць.
Мінімальны разьмер карэспандэнцыі устанаўляецца ў 10×7 с/м.
Рэкамэндуецца для розных паведамленьняў карыстацца паштовымі картамі.
Адміністрацыя п.-т. к-ры.

ЗЬВЯЗДА
ФОТО-ЦЫНКАГРАФІЯ ПРЫМАЕ ЗАКАЗЫ
НА КЛІШЭ
ШТРЫХОВАЯ ТОНАВАЯ-СЕТКА
МАСТАЦКАЕ ВЫКАНАНЬНЕ РЭСУНКАЎ
З ЗАКАЗАМІ ЗВАРОЧВАЦЦА У ГАЛОЎНУЮ КАНТОРУ ГАЗЭТЫ „ЗЬВЯЗДА"-МЕНСК, САВЕЦКАЯ, №63, 3ЦЯ ПАВЕРХ.
ПАРТРЭТЫ, ГРАВЮРЫ, ПЛЯНЫ, СХЭМЫ, ФАКСІМІЛЕ, ЭТЫКЭТЫ, ЦЭНЬНІКІ, ВОКЛАДКІ, ВІНЬЕТКІ, РЭКЛЯМНЫЯ ПЛЯКАТЫ І ІНШЫЯ МАСТАЦКІЯ РАБОТЫ.

З 1-га жніўня г. г.
ПАЧЫНАЕЦЦА ПРЫЁМ ЗАЯЎ на 2-х гадовыя 1-я менскія АГУЛЬНА-АДУКАЦЫЙНЫЯ КУРСЫ.
Да заявы трэба прыкласьці наступныя дакуманты:
1) пасьведчаньне аб сканчэньні сямігодкі; 2) дакуманты аб сацыяльным становішчы; 3) мэтрычную выпіс; 4) давецку аб здароўі; 5) анкету, завераную мясцкомам ці міліцыяй (для гарадзкіх), і райвыканкомам (для вясковых); 6) зьвье фатаграфічныя карткі.
Заявы прымаюцца штодзенна за выключэньнем нядзелі ад 4-х да 8 гадз. увеч. у канцылярыі курсаў — Інтэрнацыянальная, 31, тэл. 12-56 (3-ці паверх).

АДПУСКНІКІ!
НЕ ЗАБУДЗЬЦЕСЯ ПЕРАД АДЫХОДАМ — У ВОДПУСК ПАВЕДАМІЦЬ У — кантору газэты „ЗЬВЯЗДА" Савецкая, 63 тэл. 7-81
ВАШ НОВЫ АДРАС
Вам будзе пасылацца «ЗЬВЯЗДА» па месцы знаходжаньня ў водпуску
без асобнай даплаты за перамену адрасу.

Згубленыя і ўкрадзеныя дакуманты лічыць несапраўднымі

Вуч.-конская кніжка № 124 Галай І. І., выд. Лепельскім РВК. 660
Асабовая кніжка Янушэвіча Я. К., выд. Грэскім РВК 661
Вуч.-конская кніжка № 150 Кошмана І. Р., выд. Тураўскім РВК 662
Асабовая кніжка № 61 Ямчэнка Е. І., выд. Нараўлянск. РВК 663
Пашпарт № 1909, служ. вайсков. кніжка № 208 Галавея Л. М., выд. Тураўскім РВК. 664
Паявая кніжка Буянова С. І., выд. Чавуск спажывецк. т-вам. 665
Вуч. вайсковая кніжка № 1754 Сталярова М. А., выд. Юравіцкім РВК. 666
Вуч.-конская картка № 77 Рака Л. В., выд. Калінкавіцкім РВК 667
Вуч.-конская кніжка № 3613 Ждановіча І. І., выд. Бярэзінскім РВК. 668
Вуч.-конская кніжка № 3756 Ждановіча В. І., выд. Бярэзінскім РВК. 669
Паявая кніжка Сомарова Л., выд. Чавуск. спажывецк. т-вам. 670
Вуч.-конская кніжка Курсевіча П. А., выд. Бярэзінск. РВК 671
Вуч.-конская кніжка Пузейчука С. Д., выд. Нараўлянск. РВК. 672
Кандыдац. картка № 28309 Бабак Г. І., выд. Самахвал. РК КП(б)Б. 673
Членская кніжка № 6-7621 Сямашка Ф. М., выд. саюзам будаўнікоў. 674
Паявая кніжка Камарова П. М., выд. Чавускім спажывецкім т-вам. 675
Паявая кніжка Пець У. Е., выд. Чавускім спажывецкім т-вам. 676
Вуч.-конская кніжка № 2320 Ромышца О. А., выд. Бягомльскім РВК. 677

Друкарня газэты «Зьвязда», Менск

Менск. Галоўлітсел № 599

Линейная калибровочная мишень LRT-BE4-V2